Самагонка і частушкі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

У Крыўцы ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 2 (2644) Год LII | Беласток, 14 студзеня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

2006 год у Гацьках

Гацькі — невялікая мясцовасць непадалёк Бельска, якую складаюць тыповая беларуская вёска ды адзін жылы корпус, што астаўся ад дзяржаўнай аграрнай гаспадаркі, якая тут была ў часы так званага сацыялізму. Агулам у Гацьках цяпер пражывае шэсцьдзесят сем'яў, калі ўлічваць дзесяць адзінокіх асоб. Усіх жыхароў тут сто восемдзесят. Можна сказаць, што ў сярэднім жыхары Гацькоў з'яўляюцца маладымі. Дзяцей і моладзі больш чым бабулек і дзядуляў. На працягу 2006 года трое жыхароў адышло ў вечнасць, прытым памёр найстарэйшы жыхар, якому мала бракавала да стогадовага ўзросту. Цяпер ніхто не хоча прызнавацца да звання найстарэйшага ў вёсцы. Мінулы год быў асаблівы з-за чатырох вяселляў, што не здаралася за апошнія пяць гадоў. На жаль, тры маладыя пары, згуляўшы вяселле ў бацькоў, пасяліліся жыць у горадзе. Адны маладажоны засталіся ў вёсцы і такім чынам

адрамантавалі па-еўрапейску краёвую дарогу, што пралягае каля Гацькоў.

У мінулым годзе з'явіўся яшчэ адзін здабытак. Праўда, не ў самых

апошнім часам у Гацьках маем наймалодшага, адзінага народжанага ў гэтым годзе, **вяскоўца**, якога назвалі Матэвушам. Асаблівасць вёскі яшчэ і ў тым, што няма пустуючых хатаў, хаця некаторыя ўласнікі жывуць у іншых мясцовасцях, але часта наведваюць свае сялібы.

Мінулы год быў даволі добры для жыхароў Гацькоў. Бадай ніхто не збяднеў, хаця ніхто занадта і не разбагацеў. Найбольш грошай атрымалі гаспадары, у якіх мнагавата гектараў, а гэта дзякуючы еўрасаюзным даплатам. І таму мінулы год для Гацькоў, у пэўным сэнсе, запішацца ў гісторыі. Справа ў тым, што здадзены тут у карыстанне Інтэрнэтны перадатчык і ўжо ў пятнаццаці дамах ёсць сувязь з цэлым светам. А такімі цывілізацыйнымі выгодамі як тэлебачаннем, тэлефоніяй, ці рознымі машынамі, бадай усе карыстаюцца на працягу ўсяго года. Да таго за апошнія месяцы Гацьках, але датычыць ён менавіта самага вялікага скарбу гэтай мясцовасці. Польскія вучоныя па геалогіі, батаніцы ды археалогіі выдалі кніжную публікацыю з фільмавым запісам аб самабытных каштоўнасцях прыродна-археалагічнага краявіду ў Гацьках. Навуковая манаграфія — плён даследаванняў у Гацьках, якія вяліся тут на працягу дзесяткаў гадоў. Для таго, каб забяспечыць незвычайную спадчыну сваёй Малой Айчыны, дзейнічае Таварыства „Гай". Дзякуючы дафінансаванню з еўрапейскага фонду для Еўрарэгіёна «Белавежская пушча» ў мінулым годзе быў рэалізаваны праект пад назвай *Сельскія гасцінцы — супольная спадчына.* У выніку мерапрыемства на тэрыторыі Гацькоў ды ў суседніх вёсках Райску і Храбалах зроблены былі інфармацыйныя табліцы на польскай, беларускай ды англійскай мовах, указальнікі з кірылічнымі і лацінскімі літарамі, месцы для прыпынку ды выдадзены інфарматар для турыстаў, якія штораз часцей наведваюць Бельшчыну. Падсумоўваючы 2006 год у Гацьках некаторыя жартуюць: ***«Гай» жыве!***

Ян Мордань

Скарбы Гацькоў ☞ 5

У прадшколлі ☞ 6

Шчаслівыя ☞ 9

Куцця ў Трасцянцы ☞ 10

Слёзы радасці ☞ 11

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

9 770546 196000

А і В сядзелі на трубе

Напярэдадні новага года расійскія і беларускія тэлеканалы зазвычай дэманструюць культавы савецкі кінафільм „Іронія лёсу альбо З лёгкай парай!" з Андрэем Мягковым і Барбарай Брыльскай у галоўных ролях. Паказвалі яго неаднаразова і на гэты раз. Толькі тэлегледачоў, напэўна, больш займаў іншы „фільм" — пра расійска-беларускія эканамічныя-камічныя дачыненні. На авансцэне знаходзіліся кіраўнікі расійскага „Газпрама" і першыя асобы ўрада Беларусі. А навагодняе віншаванне прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адрасаванае „саацечаственнікам", больш нагадвала зводку з палёў вайсковых бітваў.

Чарговая дамова пра пастаўкі газу ў Беларусь была падпісаная за пяць хвілін да Новага года па маскоўскім часе. З 1 студзеня 2007 года расійскі газ для Беларусі каштуе ўжо не 47 звыклых долараў, а ўсе 100 так ненавісных у краіне рынкавага сацыялізму грашовых адзінак. Пагадненне падпісана на нявыгадных Беларусі ўмовах, бо разлічвацца давядзецца акцыямі Белтрансгазу, які мае стратэгічнае значэнне для бяспекі нашай краіны. І што такое аддаць пяцьдзесят адсоткаў акцый не трэба тлумачыць нават гуманітарыям. Праўда, з боку расійскіх палітыкаў і аналітыкаў ёсць меркаванне, што беларуская ўлада зноў падмане „вялікага брата", але, здаецца, маскоўцы настроены на гэты раз надзвычай актыўна і бязлітасна.

Павышэнне коштаў больш чым у два разы ўжо сёлета сур'ёзна адаб'ецца на стане беларускай эканомікі. Газавыя ін'екцыі скончыліся. Міт пра „саюзнае гасударства" лопнуў умомант як мыльная бурбалка. Старэйшы „брат" без кроплі жалю і ёты спачування накінуў пятлю, ад чаго паветра хутка пачало псавацца. Вось такая прадказальная „Іронія лёсу альбо З цяжкім газам!".

Па аналогіі з дзіцячай моўнай забаўкай можна сказаць: „А і В сядзелі на трубе...", дзе А — Аляксандр Лукашэнка, а В — Валодзя Пуцін. Хоць афіцыёзныя беларускія медыі спярша і падавалі сітуацыю, нібы ва ўсім вінаваты „Газпрам" — гэткі бязлітасны монстр, дзяржава ў дзяржаве, клан прагных капіталістаў, які разбурае саюзныя пагадненні і не хоча аб'яднання дзвюх вялікіх дзяржаў у яшчэ больш вялікшую. Нібыта, крамлёўскае кіраўніцтва і ні пры чым. Ды практычна ўсім зразумела, хто сядзіць на ўсходнім канцы газавода і трубіць наступальны марш.

Ну а далей, як кажуць, пайшло-паехала. Падобна на тое, што паміж дзвюма краінамі (паводле сённяшняй дзяржаўнай існасці, сапраўды вельмі падобнымі) разгараецца мытная эканамічная вайна. Расія блакавала пастаўкі беларускага цукру, які прастойвае цяпер цэлымі эшалонамі на запасных пуцях. У адной толькі Оршы стаіць мёртвым грузам 140 вагонаў цукру. Куды яго цяпер падзенеш? Да Ірана далёка, да Кітая таксама. А больш сяброў і не засталося. Між іншым, страты беларуская чыгунка ацэньвае ў 600 тысяч долараў. У адказ на „салодкую блакаду" беларускі бок заявіў, што з гэтага часу ён будзе браць грошы за транзіт праз тэрыторыю Беларусі ў еўрапейскія краіны расійскай нафты. Нават падлічана і абвешчана, што Беларусь за год павінна атрымаць ад Расіі больш 4 мільярдаў долараў (па 45 долараў за кожную перакачаную праз тэрыторыю партызанскай рэспублікі тону нафты). Змянілася і рыторыка прапагандыстаў на беларускіх тэлеканалах. Цяпер у прычынах канфлікту наўпрост вінаваціцца ўся Расія, якая вераломна здрадзіла шчыраму сяброўству. Аляксандр Лукашэнка публічна заявіў, што гатовы пайсці са сваім народам нават у зямлянкі, але не скарыцца. Зразумела, што сталі расці антырасійскія настроі. А сталічныя камсамольцы нават пікетавалі ў Мінску расійскае пасольства.

Што датычыць Крамля, то ён наўрад ці да канца пралічыў усе хады наперад. Тут трэба быць вялікім шахматыстам, не меншым як Гары Каспараў (ды той, да слова, якраз зацята выступае супраць пуцінскай улады). А з той жа дзіцячай шарады вядома, што калі з трубы падае А, то прападае і Б, ці ў нашым разе В. На трубе тады застанецца толькі „і", расстаўляць кропкі над якім будуць ужо іншыя палітыкі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

2006 год — за намі

І зноў годзік за намі. Якім жа быў ён для нас? Як каму. Адным добры, другім — не зусім, а трэцім і зусім „хрэновы", відаць, як і заўсёды. У многіх аспектах аднак быў ён нетыповым годам.

Нетыповым быў ён напэўна ў кліматычных адносінах. Вясной, напрыклад, надзвычай доўга трымалася халоднае надвор'е. Толькі пад канец яе пацяплела і трымалася такая пагода ўжо стабільна. І гэта прычынілася да багатага ўраджаю садавіны. Бо хаця і пазней абудзілася яна з зімовага сну і пазней зацвіла, але ўжо потым не было так шкодных ёй вясенніх прымаразкаў.

Лета наадварот, было надзвычай гарачае і сухое. Халодная вясна і летняя засуха некарысна адбіліся на многіх палявых культурах — і яны далі горшы ўраджай.

Восень была спрыяльная, прыгожая і доўгая. Яна па сутнасці пратрымалася аж да Новага года. Была яна таксама вельмі багатая грыбамі...

А цяпер гляньма на людны людскі свет. Якім жа ён быў у 2006 годзе?

Гарачым, крывавым, узрыўным. У многіх рэгіёнах і краінах свету гарэла, кіпела, канфліктавалася. І такіх гарачых месц, на жаль, не меншала, а прыбывала.Проста як бы людзі самі шукалі сабе дзіркі, бяды, бо ім надаела ўжо жыць спакойна, дружна, па-Божаму.

У Палесціне, напрыклад, не толькі надалей б'юцца арабы з жыдамі, але пачалі біцца арабы між сабой. Гінуць, калечацца, кроў праліваюць там людзі. І, здаецца, надалей рабіць гэта будуць. Вайну, беспарадкі лягчэй пачаць, як закончыць...

Пра Ірак ужо і гаварыць цяжка. Велізарнае свінства зрабілі яму „цывілізаваныя" Злучаныя Штаты Амерыкі са сваімі памагатымі. Распялі іракцкі народ, а іх прыгожую краіну ператварылі ў Галгофу... А такія крыўды не праходзяць бяскарна крыўдзіцелям. Вось і гразнуць штораз мацней у гэтым балоце амерыканцы і цягнуць за сабой сваіх памагатых. З намі ўключна, на жаль...

Камуністычным карэйцам і мусульманскім іранцам заманулася мець уласную атамную бомбу. Вось і робяць яны дасло́ўна ўсё, каб займець такую зброю. І напэўна займеюць, калі яшчэ не маюць яе. І гэта вельмі кепская вестка ўсяму жывому людскаму свету. Канешне, вельмі кепска, што ўвогуле паявілася бомба такой магутнай знішчальнай сілы. Тым больш, што напрадукавалі ўжо іх столькі, што можна некалькі разоў знішчыць імі ўсё жывое на Зямлі або і выбіць са сваёй арбіты нашу святую Зямельку...

Пакуль, аднак, гэтая д'ябальская зброя знаходзіцца ў руках адказных дзяржаў і народаў, можна спакайней жыць і глядзець у будучыню. А калі яна ў руках фанатычных „шаленцаў" не дай Божа — гэта ўжо зусім іншая справа...

Я часта прыглядаюся Расіі. Шчыра шкадую расіян і спачуваю ім. Яны ж не чужыя нам — мы братнія славянскія народы. У нас адна рэлігія, падобныя мовы, культуры, традыцыі. Многа звязана з Расіяй нашай гісторыі і нашага, лепшага ці горшага, лёсу.

Вельмі цяжкая доля дасталася апошнім пакаленням расіян — войны, рэвалюцыі, голад, будова сацыялізму і камунізму. Доўга, цяжка, вялікім коштам і багатай данінай крыві абыходзіліся яны. Рэвалюцыі і войны былі пераможнымі, а вось камунізму так і не збудавалі яны. Бо і збудаваць не маглі — гэта ж чысцейшая утопія. Значыць і рэвалюцыя дарэмнай была і трэба зноў вяртацца да капіталізму. І вяртаюцца яны.

Цяжка, няўмела і карупцыйна будуецца ў Расіі капіталізм. І будуюць яго ў асноўным тыя ж, якія яшчэ так нядаўна верай і праўдай будавалі камунізм. Ярыя камуністы проста на вачах ператвараюцца ў не менш ярых капіталістаў. Парадокс нейкі.

Адным словам, дарога Расіі ад царскага капіталізму да савецкага сацыялізму — гэта дарога праз мукі. Нялёгкая і паваротная дарога — ад сацыялізму да новага расійскага капіталізму. Цяжка падымаецца Расія з каленяў, але падымаецца і даволі хутка расце ў сілу. І так здаралася ўжо з Расіяй няраз.

Актуальна кіруючыя Расіяй кадры, ад прэзідэнта ўніз, у асноўным маладыя, добра падрыхтаваныя і, здаецца, жадаючыя зрабіць Расію нармальнай краінай. Але да праўдзівай нармальнасці ёй яшчэ далекавата...

Ну і наша шаноўная Польшча. Здаецца ўсё ў нас ёсць, каб быць моцнай, заможнай, дэмакратычнай і шанаванай краінай. Бо і добрае геаграфічнае палажэнне ў нас, прыродныя багацці і высокаадукаваныя кадры маем. І столькі ўжо год рыначную гаспадарку маем.

У чым жа справа?

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Гаворыць маё TV

З увагай — зноўку — я ўчытаўся ў ліст іерархаў польскай Праваслаўнай царквы з нагоды Раждаства Хрыстовага. „Чалавек забывае аб хрысціянскай веры, а хрысціянства стала для шмат якіх асоб прадметам розных асуджэнняў і напасцяў, перашкодай у іх паўсядзённым жыцці", — я ўчытваўся ў саборныя словы. Епіскапы выказаліся таксама на тэму перасяленняў украінцаў і лемкаў у 1947 годзе ў ходзе акцыі „Вісла": „Не зважаючы на рознага роду клопаты, перажыванні і цяжкасці, яны цвёрда стаялі пры сваёй праваслаўнай веры. Многія з іх да сёння засталіся калонамі веры і сведкамі святога праваслаўя ў шмат якіх месцах нашай айчыны".

Так здарылася, што гэтыя епіскапскія словы я чытаў тады, калі з усіх каналаў у маім тэлевізары даляталі іншыя словы: „Біскуп Вельгус быў агентам", „Біскуп Вельгус быў сексотам" (сакрэтным супрацоўнікам). Тады я выключыў тэлевізар, бо колькі ж можна слухаць адно і тое ж. Ну, можа і можна, калі не аплачваеш абанемент TV. Тады я заглянуў у апошні нумар штомесячніка „Czasopis". І ўчытаўся ў словы епіскапа Іакава: „Адно з'яўляецца пэўным, што спецслужбы ПНР дзейнічалі ўсюды, таму, несумненна, і ў праваслаўным асяроддзі. Я хацеў бы, аднак, адзначыць, што для веруючага чалавека, апрача людскога суда, ёсць яшчэ, а можа ёсць перш за ўсё — Божы суд. А гэты апошні — справядлівы і аб'ектыўны. Даўнія справы, а ўжо ведаем з вопыту, што цяжка іх ацаніць справядліва, найлепш было б пакінуць непадкупнаму суду сумлення кожнага чалавека. Хрысціянства ж з'яўляецца рэлігіяй даравання". Гэтыя словы прыгадалі мне іншыя, якія прагучалі больш-менш паўгода таму, на хвалі абвінавачанняў у супрацоўніцтве з камуністычнымі службамі бяспекі хадайніка за экуменію ксяндза Міхала Чайкоўскага, выказаныя епіскапам Іераміяй: „Аб віне можна гаварыць адно тады, калі тая віноўнасць была адназначна пацверджана і толькі аб'ектыўнай інстанцыяй". Пазней епіскап Іерамія дадаў: „Пакуль не даказана, што хтосьці віноўны, нельга чалавека абвінавачваць у СМІ. Такія паводзіны сапраўды абураюць і не могуць мець месца, паколькі пярэчаць усім прынцыпам так логікі, як і грамадскага жыцця".

І далей: „Я не ведаю, чаму можа паслужыць вынік люстарцыі. Часта можа знішчыць чалавека ў грамадскім жыцці". Урэшце: „Вельмі часта сумленныя людзі не рашыліся на супрацоўніцтва, але адбывалі размовы ў надзеі, што можа штосьці высветляць, можа ў чымсьці памогуць вырашальнікам, каб іх рашэнне было належнае".

Тое, што я назіраў у гэтым маім тэлевізары ў сувязі з г.зв. справай біскупа Вельгуса, было супраць любых прынцыпаў грамадскага жыцця. Журналісты ўвасобіліся ў непадкупных суддзяў сумлення. З якім жа яны палам перадавалі кожны ньюс з падказак спачатку нефармальных з Інстытута нацыянальнай памяці і больш фармальных, як хоць бы прафесара Анджэя Пачкоўскага! А мяне, шматгадовага журналіста, больш цікавіла тое, што мабыць менш ньюсавае: чаму біскуп Вельгус гэта рабіў і якія гэтага былі вынікі. Можа хацеў быць шчытом, агнцом-ахвярай за грахі свету. Такіх адказаў я не пачуў у гэтым маім тэлевізары. Дык я тады зноў узяў у рукі калядны ліст праваслаўных епіскапаў: „Чалавек, які адрынуў Хрыста, сам на сябе дае прысуд, чужая яму становіцца хрысціянская радасць, няма для яго святасці, няма веры ва ўласную несмяротнасць і перамогу духу над целам". А ад сябе я толькі дадам: не звар'яцей, Мацей, ад свайго тэлевізара.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Самагонка і частушкі

фота Міхала Мінцэвіча

У Н. прыперліся мы з С. за самагонкай пад Гагатуху, або як кажуць пра 13 студзеня ў народзе: *na Sylwestra po raz drugi*. Там танна і даступна. За дзве паўтаралітровыя бутэлькі, такія з-пад напою „Ноор", самагоншчык „Бунька" патрабуе толькі пяцьдзесят злотых. У канкурэнцыі — значыць у „Бонда", таксама пяцьдзесят, gratis драўляны зубр для турыстаў і бярозавы венік для тутэйшых у падарку. Нават заплату прымаюць у натуры, у канкрэтнасці — жыта і бульбу, якія зноў пераробяць на самагонку. Можна адрабіць ім у полі, найчасцей пры выгрузцы гною з хлява ўвесну.

Паколькі ля хаты самагоншчыка „Бунькі" стаяла паліцэйская машына, мы крыху злякаліся і адразу падаліся ў бар „Амазонка".

— Kopa lat! — не крыкнуў, а вісну на прывітанне Грышка, вядомы ў наваколлі таксама пад мянушкай „Цэбрык-калода". Калода пацалаваў мяне ў руку і папрасіў С., каб той зрабіў нам памятны здымак яго *камуркай*.

— Wiesz, bardzo cię lubię, Ewulka! — сказаў па-польску.

Цэбрык ніколі не адазваўся да мяне па-свойму, нават калі я яго далікатна папракала, прасіла, каб не рабіў з сябе дурня. Але, дарэмна. Калода зацяўся і з жанчынамі гаворыць толькі па-польску. Я была сведкам як да французжанкі гаварыў на нейкім мазурска-гуральскім слэнгу. Не перашкаджала яму інфармацыя, што французжанка ні ў зуб не кеміць па-польску!

— Але чаму ля „Бунькі" стаіць паліцыя? — спыталіся мы.

Пахла няўдачай. І як на злосць, канкурэнцыя, значыць, „Бонд" і яго жанчына якраз паехалі ў магазін „Бядронка":

— Ці хто данёс на „Буньку"? — пыталі мы. — А можа санэпідэмстанцыя якая прыдзіраецца.

— А дзе там! — прашаптаў Грышка. — І яны за таварам прыехалі.

Мы паверылі Цэбрыку. Бо што тут такая паліцыя! На Гайнаўшчыне ходзяць чуткі, што ў Н. сам Цімашэвіч за самагонкай заязджае. Кожны раз, калі гоніцца ў сваю пушчанскую дачу.

Праўда, дзве гадзіны пазней мы купілі тры „гопы" *праваслаўнай* — як кажуць у Н. пра гэты напой. „Бунька" не выглядаў на запалоханага, наадварот, ён спытаў мяне пра кошт рэкламы ў нашай газеце. І gratis далажыў пруток вэнджанай каўбасы.

— *Это за чудзесный календар і „Ніву"!*

* * *

Яшчэ раней паказаць свой, значыць, наш „каляндар", начапіўся Гжэсек-Калода. Мы, аднак, пільнавалі, каб у зручны момант шмыгануць да „Бунькі". Шкада, каб чарга прапала. Цераз Н. усё ганяліся незнаёмыя машыны.

Гжэсек пазяхаў ад тае нудоты, якая тут атакавала з кожнага кутка. У бары драмаў толькі адзін кліент. Здалёк выглядаў як капіца балота. У пэўны момант я прыкмеціла ў Гжэська новыя зубы. Сапраўды, і ўгары, і ўнізе, у роўных шарэнгах бялелі зубалі.

— О-го-го, браце! — павіншавалі мы Кадолу з новым гарнітурам зубоў. — Малайчына ты! Урэшце надумаўся.

— І prawo jazdy ja sobie zrobił, — пахваліўся Цэбрык.

Толькі цяпер мы прыкмецілі, што ў Н. ідзе не адно Новы год, але і новае шчасце.

Праўда, Грышка пазяхаў сабе як паравоз, але што зробіш — сёлетняя зіма дэпрэсіўная, няма ахвоты жыць.

— Ты, мабыць, жаніцца збіраешся? — спыталася я ў Гжэська. Але ён, замест пахваліцца дзяўчынай, толькі пачырванеў. Пасля паветра працяў хрыплы голас.

— Скажы ім пра старую Маркачыху! — зарагатаў нехта ў кутку. Да гэтай пары мы не ведалі, што за намі сочаць. І хто — тая куча балота. Гэта быў Антоша Круп, вядомы ў Н. і наваколлі як любіцель курэй і пеўняў, гараскопаў і салёнай парнухі. Антоша таксама пацалаваў мяне ў руку:

— Прабачце, што я не „в курсе дела", — сказаў Круп. Гэта было чыстае какецтва. Мы ведалі, што ён усё ведаў, хаця б па адных гараскопах!

* * *

— Толькі абяцай, — Калода какетліва мне падмаргнуў, — што не напішаш пра гэта ў газету.

— О-кей, не напішу!

Спачатку расказ не клеіўся і трэба было яго падліваць півам, якое мы фундавалі Грышку і яго карэктару — Антошу Крупу. Той толькі час ад часу ўваходзіў у слова і казаў: гэта няпраўда, было інакш!

— А можа напішы, — змяніў тактыку Грышка, — хай людкове пасмяюцца. А то зіма такая сумная.

— О-кей! — пагадзілася я. Хоць... паміж словамі веяла маніпуляцыяй.

Паводле Калоды, усяму вінаваты Еўрасаюз, у канкрэтнасці еўрадаплаты да нізкатаварных гаспадарак. Інакш Грышка ніколі не патрапіў бы на багоннае ўрочышча „Гнілец". Ад вайны ніхто з ягонай сям'і не касіў там асакі, не карчаваў дзікага кустоўя. Ад месца адхілялі вочы, асабліва пасля здарэння, калі ў „Гнільцы" ўтапілася карова Максімкавых. Гэтую нядбайнасць рашыў выправіць сам Грышка. Вядома, за падшэптам Бруселя, які плаціў яму за кожны дадатковы апрацаваны кавалак зямлі. Ад раніцы да вечара хлапец шчыраваў усю восень на балоце. Ён пілаваў карчы, рэзаў альшыну, касіў рагоз і трыснёг.

— А ў гэты дзень уляцеў мне камар у вока, — успамінае Калода, — і я, не думаўшы, пайшоў да Маркачыхі. Яе хатка стаіць сто метраў ад майго балота.

Мы ведалі, што ў маладыя гады Маркачыха займалася найстарэйшай прафесіяй свету. Калі ёй стукнула восемдзесят (пра гэта даведаліся ў Н., дзякуючы канцэрту пажаданняў), мужчынскі пол стаў абмінаць яе хату.

— Яна ахвотна мне дапамагла, — цягнуў Грышка, — найперш язычком выняла мне камара з вока, пасля мяне распранула і згвалтавала!

— Але ж... падзея! — зарагаталі ўсе, у тым ліку і барменка Алька, якая дагэтуль была прыліпла да экрана тэлевізара.

— А ты на паліцыю хадзіў?

— Пайду, — адказаў „Цэбрык".

Паколькі пахла тут секс-афёрай, якую ў Н. намерыліся раскрунуць пры дапамозе нашай газеты, мы сталі ўголас сумнявацца і ставіць пытанні:

— А ёсць у цябе доказы?

— Ёсць, — адказаў.

* * *

— Вы не верце яму, — Антоша Круп зайздросціў, што дзякуючы гэтай гісторыі ўся ўвага была накіравана на Калоду. З часам аповед Грышкі мы таксама пусцілі між вушы.

Ён пра той гвалт апавядаў кожны раз інакш. На канец высветлілася, што ўдава Маркачыха яго не згвалтавала, а толькі пацалавала.

Мы належным чынам ацанілі спрыт дуэта Калода — Круп. Іх гісторыя напамінала змест частушак, дзе рэзка вызначаная розніца ў гадах паміж каханкамі.

Пасля Антоша Круп сказаў нам у сакрэтнасці, што „Цэбрык" працуе для „Бунькі". Калі ўласніка самагоначнай мануфактуры няма ў хаце, той забаўляе кліентаў. Мы былі, дарэчы, жывым прыкладам гэтаму.

Хоць у Н. пахла ўжо капіталізмам, мы павярнулі ў бок гагатушнай традыцыі. Калі мы пакідалі вёску, я выскачыла з машыны і сваёй чырвонай памадай нашрайбавала на плоце Грышкі гагатушны надпіс: „Калода — жаніць!"

Пасля, як сказалі мне па-тэлефоне, нехта яшчэ дапісаў: „Калода, не валяйся! Жаніць — каб дурні не звялісь!"

Ева СЦЕПАНЮК

фота Уладзіслава Завадскага

Куцця ў святліцы

Вечарам 28 снежня 2006 г. у вясковай святліцы ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) арганізавалі Куццю для ўсіх ахвотных жыхароў Ляўкова і аколіц. Прыйшлі на яе настаяцель Стараляўкоўскага прыхода а. Леанід Янкоўскі і вікарый а. Ян Гацута з матушкай ды радны і старшыня адной з пастаянных камісій Гміннай рады ў Нараўцы Ян Целушэцкі, прыхаджане, члены царкоўнага хору. Са сцэны ўсіх радавала ёлка.

Найперш дзеці выступілі з пастаноўкай „Ноч у Віфлееме". Спецыяльна да яе падрыхтавалі неабходныя рэквізіты, адзенне. Паспяхова свае ролі гралі маладыя акцёры: Караліна Рэент, Клаўдзія Лясота, Эмануэля Мірановіч, Магдаліна Сухадола, Ева Саковіч, Матэвуш Лясота, Матэвуш Казакевіч, Андрэй Бірыцкі і Губерт Саковіч. Атрымалі яны падзяку ад а. Леаніда Янкоўскага за ўдзел у спектаклі і за падтрымку традыцыі святкавання Раждяства Хрыстова, калядавання. Дзеці дэкламавалі вершы і спявалі калядкі „Учора з вячора", „Нова радасць стала" і „Раждяство Хрыстова".

Пасля ўсе за сталом частаваліся поснымі стравамі, якія рыхтуюць на Куццю. На стале ляжалі таксама яловыя галінкі. Перад пачастункам усе дзяліліся просвірняй ды згаварылі малітву „Отче наш".

Вечар калядак прадаўжаўся больш дзвюх гадзін. Дарослыя і дзеці ўжо разам праспявалі дзевяць самых прыгожых калядак. Гэтак усе славілі Ісуса Хрыста.

Святы вечар і Куццю арганізавалі кіраўнічка святліцы ў Старым Ляўкове Галена Рэент і кіраўнічка бібліятэкі ў гэтым жа Ляўкове Аліна Барташук.

(мох)

Як зарабляюць?

У снежні 2006 года на пунктах скупкі жывёлы ў нашым ваяводстве за свініну першага класа плацілі 3,20 зл. за кілаграм, а ў іншых рэгіёнах краіны цэны былі яшчэ ніжэйшыя, нават да 3 злотых. Давялося мне ў той час пабываць у адной прыватнай вясковай краме (мясцовасці не называю). Якраз трапіў я на дастаўку мяса ды мясных вырабаў і прыгледзеўся да цэнаў выстаўленых прадаўцом крамы. Убілася мне ў галаву цана свіных касцей — аж 3,40 зл. за кілаграм і адразу прыйшла на думку цана жывой вагі на скупцы. Аказваецца, што за жывую цану кілаграма парсюка не купіш у краме кілаграма голых касцей! А каўбаска „пальцоўка" была выценена на 21 злот за кілаграм.

Калісьці пры санацыі, калі па нашых вёсках ездзілі фурманкамі жыды і куплялі парсюкоў, дык заўсёды гаварылі, што ім не трэба зарабляць злот на злот, а хопіць грош на грош. Тады сяляне думалі, што жыды вельмі мала зарабляюць, бо толькі грош на грош.

Цяпер у нашай дзяржаве гандлёвыя пасярэднікі і мясакамбінаты зарабляюць грош на 10 грошаў і то яшчэ абанкручваюцца і ўпадаюць. Прадпрыемствы, якія абанкруціліся, нарабілі даўгоў дзяржаве, іх кіраўнікі не нясуць адказнасці за даўгі, а падаткаплацельшчыкі ўсё папоўняць. Дырэктары і старшыні былых прадпрыемстваў пабудуюць уласныя прадпрыемствы і будуць надалей „кляпаць" неяк сваю бяду ды гаварыць, што ледзь зводзяць канцы з канцамі. Вось, якая праўда цяпер у нашай дзяржаве.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Час праўду сказаць...

За войтам (Міхалам Врублеўскім) сцяной стаў „жалезны" электарат — пенсіянеры.

Выбары на Гайнаўшчыне праходзілі наогул спакойна і без парушэнняў закону, апрача інцыдэнту ў Чаромсе. У час падліку галасоў выявілася 111 нештампаваных бюлетэняў. Справу разглядаў суд. Праўда, прызнаў парушэнне правілаў, але ў агульным выніку не паўплывала гэта на вылучэнне пераможцы на пасаду войта ў першым туры.

У другім туры змагаліся два кандыдаты (у першым было чатыры): Міхал Врублеўскі, які да таго часу заставаўся на пасадзе і настаўнік мясцовай Гімназіі Ежы Шыкула. Спадар Врублеўскі перамог канкурэнта невялікім лікам галасоў, але зважыўшы тое, што на нештампаваных картках 100 галасоў было за Шыкулам (якія былі адкінуты камісіяй), прыйшлося яму задумацца над тым як прыцягнуць выбаршчыкаў, каб не страціць мяккае крэсла. Чаромхаўская грамадскасць падзялілася на два лагеры. Хто спадзяваўся перамен, далучаўся да Шыкулы. За былым войтам сцяной стаў „жалезны" электарат — пенсіянеры.

Я мімаволі ўключыўся ў замкнуты лагер прыхільнікаў перамен. Я не прадчуваў, што гэтым рашэннем з'яднаю сабе патэнцыяльных ворагаў у асобе спадара Врублеўскага, працаўнікоў гміны ды аднавяскоўцаў. Да першай сутычкі дайшло на вясковым сходзе ў Кузаве 18 лістапада, мэтай якога, разумеецца, была выбарчая кампанія войта перад другім турам. Калі я ўзяў голас у дыскусіі і запытаў, колькі праектаў рэалізавала гміна і якімі еўрасаюзнымі сродкамі пакарысталася на інвестыцыі (тут спаслаўся я на дасягненні Нарвы, Нараўкі і суседніх Кляшчэляў), дык спадар Врублеўскі накінуўся на мяне з кулакамі, што я, як карэспандэнт, пішу неаб'ектыўна, бо „чужое хвалю, а свайго не бачу". Абвінавачанні я адвяргнуў без цяжкасці, бо праўда была на маім баку. Аб прысваенні Чаромсе „Залатога лаўра" ды адкрыцці Гміннага цэнтра інфармацыі, чаго справа якраз тычылася, я ўжо пісаў, аб чым гміне было вядома. Ведаў аб гэтым і спадар Врублеўскі. Але яму залежыла на тым, каб мяне акампраметаваць перад аднавяскоўцамі як неверагоднага чалавека (так ён заўсёды абыходзіцца са сваімі працаўнікамі). Задума акампраметаваць мяне аказалася асечкай. У ходзе дыскусіі я рашыў крануць яшчэ іншыя важныя для вёскі праблемы, але прыхільнікі войта, у асобах некалькіх ім падстаўленых жанчын, не далі мне слова сказаць.

22 лістапада 2006 г. выбарчы сход у Кузаве арганізаваў канкурэнт войта Ежы Шыкула. Прысутнасць была невялікая, не больш чым 26 жыхароў (на войтавым сходзе налічылі на дзесяць асоб больш, разам з бабулькамі-пенсіянеркамі, якіх мясцовая парафіянка прывяла з царквы пасля вячэрняй багаслужбы). У крузе ўдзельнікаў сустрэчы аказалася шматлікае кола сімпатыкаў войта на чале са скарбнікам гміны і старшынёй Агульнапольскага таварыства „Прыязны транспарт" у Чаромсе. Гэтыя апошнія вадзілі рэй у час дыскусіі і не дапускалі жыхароў вёскі да голасу. Калі стала вядомым, што прыхільнікі войта намагаюцца акампраметаваць Шыкулу, як неверагоднага чалавека, які здзейсніў шматлікія махлярствы ў фінансавых дакументах, калі працаваў дырэктарам Гімназіі, дык я для перамены крануў праблему пабудовы гміннага водапровада, дзе гміна, па маёй думцы, учыніла скажэнне фактаў наконт саўдзельніцтва грамадскай супольнасці ў фінансаванні інвестыцыі. Затым паставіў я скарбніку гміны пытанне: „Хто з'яўляўся арганізатарам імпрэзы на ўлонні прыроды пры здачы ў карыстанне водаправода і які быў кошт мерапрыемства?" У адказ пані скарбнік заявіла, што мерапрыемства арганізавала гміна, а на пачастунак складчыну давалі яе працаўнікі. Гэтую аргументацыю падтрымаў былы солтыс Мікалай Саўчук, які канстатаваў, што кузаўцы ніякіх грошай на водаправод не плацілі і няма патрэбы вяртацца да падзей пятнаццацігадовай даўнасці. Маё выступленне на сходзе так уразіла паню скарбнік, што наступнага дня перадала яна гэтую вестку войту. З гэтага часу ўзніклі ў мяне праблемы. Два дні пазней, 24 лістапада, працаўнік гміны адмовіў мне ў перадачы па электроннай пошце допісаў у рэдакцыю з Гміннага цэнтра інфармацыі, дзе дагэтуль такімі паслугамі я карыстаўся. На маё пытанне „Чаму?" працаўнік груба заявіў: „Na głupie pytania nie ma odpowiedzi!" Вось, дарагжэнькія, што значыць наступіць на мазоль нашаму войту! Але на гэтым не закончылася. Гэта быў адно пралог да сапраўднага спектакля.

13 снежня 2006 г. (нешчаслівая трынаццатка) рашыў я наведаць Гмінную ўправу, ды спытаць войта чаму мне нельга карыстацца Інтэрнэтам у Гмінным цэнтры інфармацыі. Калі я пераступіў парог кабінета і выявіў з чым прыходжу, мой суразмоўца заявіў: „A ja na pana czekałem, bo chciałem porozmawiać o tym, co pan mówił na zebraniu podczas mojej nieobecności". І тут жа паклікаў працаўнікоў гміны, якія прысутнічалі на выбарчым сходзе Ежы Шыкулы ў Кузаве. Нельга апісаць таго, што адбылося ў кабінеце. Спадар Врублеўскі накінуўся на мяне быццам ястраб на курыцу: „Pan mnie nóż w plecy wbija, — грымеў войт змяняючыся з твару. — Pan chciał mnie skompromitować przed mieszkańcami i Szykułą..." І тут я пачуў абвінавачанне, што быццам бы наўмысна загаварыў пра выпіўку, каб войт не мог апраўдацца. Не памаглі мае тлумачэнні, што пасля ў ходзе дыскусіі слова сказаць мне не дазволілі. А пані скарбнік далівала алею да агню і чытала мне маралі. Я адчуваў сябе быццам жаба ў каляіне. Прысуд на маю асобу, бо так я ўспрыняў гэта, выношваўся больш пятнаццаці мінут. Дагэтуль не разумею паводзін войта ва ўсім гэтым закалоце. Пра „балянгу" над сажалкамі ў лесе ведаю не толькі я, але і шмат іншых людзей у наваколлі, бо яшчэ нядаўна адзін з чарамшукоў так гэта каментаваў: „З водаправода не вада цячы павінна, але віно імшальнае." Дарэчы, на тэму чаромхаўскага войта многа распісваліся беластоцкія сродкі масавай інфармацыі. І ўсё аказалася агульнавядомай вадой на млын. З цяжкага становішча ўладар Чаромхі выходзіў пераможцам. Пракуратура спыніла супраць яго ўсе справы. Суд апраўдаў яго за абвінавачанне раднага Яўгена Тыханюка. На апошніх выбарах перамог на пяты тэрмін паўнамоцтваў. „Гэта бездакорны чалавек. Аўтарытет у грамадстве, — гавораць пенсіянеры. — Вясёлы, паслужлівы ды за ягонага панавання Чаромха паднялася". А якая ў тым праўда?

(працяг у наступным нумары)

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Прыхаваны скарб мінуўшчыны

Расказваў мне калісь Генадзь Шэмет, што калі ехаў з Беластока ў Бельск, ягоны бацька заўважыў, што мінаюць вёску Наскі. Аднак па згаданай дарозе такой вёскі няма, яна толькі ў літарах, у кірыліцы. Калі б на дарожных знаках былі назвы двухмоўныя, з прымяненнем двух алфавітаў, тады б не было сумненняў, кірыліца з лацінкай згодна інфармавалі б, што па трасе вёска Гацькі.

Але не пра нядаўна прыняты сеймавы закон аб нацыянальных меншасцях гэтая згадка, толькі дзеля зачэпкі за гэтую, здавалася б, звычайную вёску. А вёска Гацькі ў сапраўднасці незвычайная. У яе вельмі багатая гісторыя, мо нават найбагацейшая на ўсю Беласточчыну. І пісаная яна не пяром, але самой прыродай. Хаця той алфавіт прыроды чалавек вывучае няспынна, аднак і па ім ва ўстановах археалагічнай памяці Маці-Зямелькі ўдалося знайсці гацькоўскую папку, якой запісы датуюцца толькі наймалодшым перыядам галацэну наймалодшай чацвярцічнай эпохі зноў наймалодшай кайназойскай эры...

Каля 120 тысяч гадоў таму назад канчалася ў нас эпоха абледзянення. Ледавік заняў абарону на паўднёвых подступах да сённяшняга цячэння Нарвы, баронячыся перад наступам ацяплення. На перадавой ледавіка сталі ўзнікаць брэшы, праталіны. І хаця абаронца засеў у своеасаблівым акопе, пакідаючы там пасля сябе ўпадзіну, на месцы праталін сталі фармавацца камы, быццам плацдармы для вызвалення ад сібернага акупанта.

Ад цяперашняй шашы не відаць галоўнага поля тэрмічнага бою звыш стотысячагадовай даўнасці. Найважнейшыя памяткі геалагічнай мінуўшчыны Гацькоў з другога боку вёскі, край дарогі ў Райск. Зараз за вёскай раскрываецца незвычайнае для гэтай часткі Еўропы месца. У выразна ад поўдня абмежаванай упадзіне відаць два вялікія кругавідныя камы — Бэтлаг і Замок, кожны дыяметрам каля пяцідзесяці метраў і каля дзесяці метраў вышынёю. Заўважальныя і два меншыя камы.

Гэтыя рэдкія ландшафтныя формы паўсталі наступным чынам. На месцы ўпадзіны на доўгі час залягла велізарная глыба ледавіка. У той глыбе ў некалькіх месцах узніклі пунктовыя праталіны, праз якія стала сцякаць вада з тапнеючага лёду. Вада несла з сабою і ўсялякую ўсячыну, што збіралася на паверхні ледавіка — пыл і пясок. І вось тая ўсячына збіралася ў праталіне, збіралася, і такім чынам нагрувасціліся цяперашнія камы. А пад самою глыбай нічога не збіралася і ў тым месцы асталася сённяшняя ўпадзіна.

У згаданай упадзіне пасляледавіковыя камы найбольш выразна выдзяляюцца на навакольным грунце, таму яны такія адметныя. Але яны не адны; разрэз іншага кама, значна раскапанага людзьмі дзеля здабычы жвіру, відаць побач бельска-беластоцкай шашы. Пасляледавіковыя камы рассеяны і па ўсёй нашай частцы Еўропы, у тым ліку і па Беласточчыне, аднак іх складана заўважыць. Таму вось гэтыя гацькоўскія асабліва каштоўныя, бо яны проста хрэстаматыйна паказваюць працу ледавіка.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Камы Замок і Бэтлаг

Каштоўнасць гацькоўскіх урочышчаў Бэтлаг, Замок і Калыска заключаецца яшчэ і ў тым, што тут захаваліся паліналагічныя рэшткі (сляды раслінных пылкоў), якія дазваляюць меркаваць пра асаблівасці так мікраклімату, як і геамарфалогіі мясцовасці і шырэйшага наваколля.

Але сама прырода гэта яшчэ не ўсё. Гэтае незвычайнае месца не магло не зацікавіць і чалавека. Тут жа, у самым цэнтры ўпадзіны, мабыць у выніку артэзіянскага ціску, з зямлі высочваецца крынічная вадзічка, якая дае пачатак рачулцы Гай. Упадзіна, на месцы якой у міжледавіковы перыяд зарасло возера, з'яўлялася добрым грунтам для расліннасці, для першабытнага збіральніцтва. Расліннасць вабіла і звярыну, стваравочы добрыя ўмовы для паляўніцтва. У крынічнай рачулцы вадзілася рыба...

Мяркуецца, што на гацькоўскіх урочышчах чалавек з'явіўся на схіле каменнай эпохі, у неаліце (7-2 тысяч гадоў да н.э.), аднак слядоў яго пражывання ў Гацьках не выяўлена. Археалагічныя знаходкі ў гацькоўскім комплексе датуюцца на эпоху жалеза, якая тут пачалася каля трох тысяч гадоў таму назад. Недзе каля дзвюх з паловай тысячы гадоў да нас чалавек пачаў прымяркоўваць найбольш адметны кам, які сёння называецца Замком, для сваіх мэтаў. Узгорак атрымаў салідную агароджу навокал, так унізе, як і наверсе, а пасярэдзіне знівеліраванага вярха каменны насціл. Вакол кама былі выкапаны кругавыя равы. Гэтакая архітэктура характэрная для перыяду г.зв. штрыхаванай керамікі, якая ўключала элементы і мілаградскай культуры, назва якой выводзіцца ад гарадзішча Мілаград каля Рэчыцы, і г.зв. зарубінецкай культуры, якой характэрныя неўмацаваныя збудаванні раскапаныя ў мясцовасці Кашчэлічы ў Валожынскім раёне. Насельніцтва таго часу займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбалоўствам, паляваннем, здабычай і апрацоўкай жалеза...

Кам Замок быў цэнтрам грамадскага жыцця мясцовага насельніцтва ў эпоху жалеза. Тут было не толькі абгароджанае сховішча на выпадак небяспекі, тут таксама захаваліся сляды язычніцкага алтара, тут было месца культу. Штодзённае жыццё насельніцтва адбывалася побач. Адным з ачагаў тагачаснага жыцця быў адзін са згаданых малых камаў, дзе знойдзены рэшткі м.інш. печаў. Бадай, аднак, галоўным бытавым паселішчам было ўрочышча Калыска, на поўдзень ад упадзіны, зараз за яе абрывам. Знаходкі таго месца раскрываюць агромнае поле для меркаванняў пра яго насельніцтва, бо па іх можна гаварыць пра нейкую цывілізацыйную лучнасць і з Ютландыяй, і з Малдавіяй... Мабыць, у Гацьках у той час жылі людзі вельмі важных саслоўяў.

На месцах даўніх гацькоўскіх пасяленняў знойдзены прылады для выплаўкі раскошных прадметаў з бронзы і серабра ці іншых каляровых металаў: тыглі, льячкі, формы ды інструменты для іх коўкі і больш тонкай аддзелкі. Ну, і, вядома, самыя вырабы асабістага дэкору. Знойдзены і прадметы, якія паказваюць, што не самою раскошай жылі продкі нашых землякоў, яны таксама клапаціліся пра хлеб свой надзённы, шмат асталося тут рэштак глінянага посуду...

Захаваныя помнікі архітэктуры Замка найбольш нагадваюць кшалт гарадзішчаў на ўсходзе Славяншчыны, у крывіцкіх вярхоўях дняпроўскага басейна: Банцараўшчыны, Калочына, Тушамлі. Помнікі наваколля Замка даюць матэрыял для шырокіх меркаванняў пра мінулае гэтай зямлі.

Ды і пра тое мінулае, нават пра меркаванні аб ім, да нядаўна вядома было толькі даволі вузкаму кругу спецыялістаў. Памяць даўніны не захавалася ў цяперашніх жыхароў Гацькоў, тое мінулае здабываюць вонкавыя энтузіясты гэтага унікальнага так у геалагічным, як і ў цывілізацыйным ракурсе месца. Толькі ў апошні час, дзякуючы працы мясцовага таварыства „Гай", запісаная прыродай гісторыя наваколля Гацькоў выходзіць навонкі. Гацькі і суседнія вёскі пазначаны двух- і трохмоўнымі інфармацыямі. Наведвальнік, які сюды завітае, даведаецца ўжо, што ў гэтым, занядбоўваным у апошніх дзесяцігоддзях рэгіёне, калісь бурліла сапраўды бурлівае прыроднае і чалавечае жыццё.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Аб некаторых перадачах

Чаму сяляне рана падымаюцца з пасцелі? Таму, што ім трэба накарміць галодную жывёлу, падаіць кароў, здаць малако. Так нам, вяскоўцам, здавалася. Але дзесьці далёка, у самой Варшаве ці іншым ваяводскім горадзе жывуць людзі, якія лепей ведаюць прычыны ранняга пад'ёму земляробаў: селянін рана падымаецца з ложка, каб паслухаць радыёперадачы для вёскі, каб па тэлевізары паглядзець праграмы сельскагаспадарчай рэдакцыі! Ну, бо калі немагчыма нараз даіць кароў, карміць свінней і глядзець, напрыклад, перадачу «Сельская гаспадарка ў свеце» (а гадз. 5.45), то селяніну трэба выбраць адну рэч. Ну і выбірае ён тое, што падказвае яму пачуццё абавязку і сэнс ягонай працы на гаспадарцы. То хто тады глядзіць перадачы для вёскі? Ніхто, бо гараджан гэтая тэма не цікавіць, зрэшты, яны ў гэтую пару яшчэ спяць, а сяляне, хаця б і хацелі, то не могуць з-за догляду жывёлы. І які тады сельскагаспадарчым рэдакцыям сэнс прытрымоўвацца ранняй пары — не ведаю. Калі б гэтыя перадачы пусціць у эфір а гадзіне восьмай або дзевятай, то кола слухачоў і гледачоў было б намнога большае. А пры нагодзе выспаныя мяшчане таксама маглі б даведацца чаго-небудзь аб працы земляробаў і гэта напэўна ім не пашкодзіла б. Можа тады больш асоб ведала б адкуль бярэцца малако — ці ад каровы, ці з магазіна з лагатыпам божай кароўкі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ці мяшчане ведаюць вёску?

І яшчэ адна заўвага наконт перадач для вузкіх груп слухачоў і гледачоў. Ці нельга так скласці праграму, каб радыёперадачы не супадалі ў часе з тэлеперадачамі? Маю на ўвазе перадачы для нацыянальных меншасцей, якія выходзяць у эфір нядзельнай раніцай. Паглядзець і паслухаць іх нараз немагчыма і таму прыходзіцца выбіраць паміж радыёпрыёмнікам і тэлевізарам. А можа Радыё Беласток, як фірма больш дынамічная і менш залежная ад агульнапольскай рамачнай праграмы, чым рэгіянальнае тэлебачанне, магло б нядзельныя меншасныя і рэлігійныя перадачы перасунуць на пасляабедзенны час?

М. Ц.

зорка
для дзяцей і моладзі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

КУЦЦЯ Ў ПРАДШКОЛЛІ
(Беласток, 3 студзеня 2007 г.)

Кожны год бываю на Куцці ў беларускім садку. Чатыры першыя гады — як мама дашкольніцы, сем наступных — як рэдактар „Зоркі”. І здаецца яшчэ ніколі тут не было так людна, так гаманліва. Каб зрабіць здымкі трэба было праціскацца цераз сцяну народу, які, як і я, прагнуў увекавечыць гэтую ўрачыстую хвіліну. Нашы бацькі, як тыя японскія турысты, што фатаграфуюць кожную дэталь, нацэліліся ў бок выступаючых з фотаапаратамі, тэлекамерамі, фотатэлефонамі. Выступоўцаў здымала і тэлебачанне, запісвала радыё — словам, поўная медыйнасць!

— Здыміце нас у „Ніву”, — просіць юрыст Марк Кулакоўскі з Беластока. На Куццю, як у мінулы год, ён прыйшоў усёй сямейкай. З жонкай Іааннай ды двума сынкамі. Наймалодшы яшчэ на руках у мамы.

— І мы кожны год прыходзім усёй сям’ёй, — кажа Галіна Бэдэнічук. Іх сынок, Шымак, ужо трэці год у садку. Сёння будзе выступаць. На руках у Янкі Бэдэнічука іх дачушка Неля. Дзяўчынка глядзіць жывымі вочкамі на цётак і дзядзькоў, на дзяцей у беларускіх вышыванках... Ах, як цікава!

— А як прыемна паслухаць як дзеці калядуюць, — кажа спадарыня Галіна. І карысна. У хаце вывучаюць ад свайго Шымка беларускія калядкі.

— Напрыклад, „Неба і зямля”. Гэтую калядку я ведала дагэтуль адно на царкоўнаславянскай мове, — адзначае спадарыня Галіна.

Свята Каляд спадарства Бэдэнічукі адзначаць „традыцыйна”, значыць, на першы дзень паедуць у Гайнаўку, на другі — у Бельск, да бацькоў.

— Мы таксама паедзем да бацькоў, — кажа настаўніца Данута Тымашэвіч. — У Бельск. А на першы дзень свята — у вёску Ханькі, што каля Сабятына. Там жывуць дзядулі. І яшчэ дзеці ходзяць калядаваць...

Сапраўды, варта папулярызаваць калядны рэпертуар з беларускага садка! Нам дашкольнікі праспявалі аж сем беларускіх калядак. Многія з вас ведаюць іх. Гэта: „Шчодры вечар”, „Го-го каза” (вядома, з казой), „Ой, на моры-моры”, „Саўка ды Грышка”, „Неба і зямля”, „Каляда”... Спевы ўспамагаў аркестр у выглядзе чатырох настаўніц з цымбалікамі і акардэонам:

— Да каляд мы рыхтаваліся ад пачатку снежня, — кажа настаўніца Анна Бабік. — Кожны дзень праводзілі мы па дзве рэпетыцыі. Ну, але былі складанасці. Снежань — гэта месяц, калі дзеці хварэюць. Бывала, прыходзіла адно сем-дзесяць асоб з групы. Здавалася, што паспеем... Апрача калядак былі, вядома, і вершыкі, і супольнае ўпрыгожванне ёлачкі ды падрыхтоўка святочнага застолля.

Святочную атмасферу прыблізіў протаіерэй Анатоль Конах. Айцец Анатоль выступіў па-беларуску, ён прыгадаў духовае значэнне Каляд ды пахваліў нашых каляднічкоў. Выступіў ён ад імя беластоцкага епіскапа Іакава і свайго ўласнага...

А пасля чакала яшчэ застолле. Рыхтаваліся ўсе: настаўніцы, бацькі і, вядома, спадарыні кухаркі.

— А якія тут арыгінальныя стравы? — пытаю ў спадарынь Евы Савіцкай і Элі Андрасюк, якія ў час Куцці ўсё даносілі яду на багатыя сталы.

— Напэўна кісель з журавінаў, — Ева Савіцкая пералічвае яшчэ доўгі спісак калядных страў. Гэта куцця, боршч, селядцы, рыба...

— І гэта не канец, — кажа спадарыня Ева якая падрыхтуе яшчэ Куццю для манахаў Супрасльскага манастыра. А за сваім сталом будзе гасціць чатыры незнаёмыя „душы”, якія запрасіліся да яе на святы.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 13 —

Мама не хацела мяне пусціць на дыскатэку, яна дакарала мне тройкай па інфарматыцы. Але пасля абеду ў яе паправіўся гумар і яна сказала: „Ідзі!"

З майго класа прыйшло толькі шэсць асоб: я, Соня, Ганка, Міколка, Ігар, Матфейка. Дыскатэка пачалася ў семнаццаць гадзін, яе наладзілі ў нашай спартыўнай зале. Перад школай дырэктарка выставіла ахову, якая правярала ці вучні не ўносяць з сабой наркотыкаў, гарэлкі і цыгарэтаў. Падумаеце, смешная справа! Не. Ім нават пашанцавала злавіць трох жулікаў з першага класа. Хлопцы хацелі ўнесці з сабой пачак цыгарэтаў. Іх адразу завалаклі ў кабінет спадарыні Воўк. Мы пасля здзіўляліся, што ахоўнікі не абшукалі Міколку і Ігара. Хлопцы схітрылі, яны схавалі ў боты антызапорныя таблеткі, якія пасля ўкінулі ў сок, падрыхтаваны вучням дырэкцыяй.

Пасля гадзіны забавы многія пабеглі ў прыбіральню. Перад туалетам выстраілася доўгая чарга. Паркет цалкам апусцеў. Я не ведала што дзеецца. Я не піла соку. Мая сяброўка Соня, на жаль, напілася. Пасля яна або сядзела ў кабінцы, або стаяла ў чарзе да яе. Міколка з Ігарам таксама стаялі з усімі і жартавалі. Казалі, што на школу нахлынула нейкая эпідэмія. Але спадарыня Воўк не спала. Яна загадала ахоўнікам яшчэ раз абшукаць заплечнікі вучняў. Тыя ператрэслі ўсе заплечнікі і кішэні, аж знайшлі пусты пакет з-пад таблетак ад запору. Яны валяліся на падлозе ў распраналцы.

— Давайце сюды Міколку, — сказала Воўк. Яна ўхапіла жулікa за каптур і павалакла ў свой кабінет. Ззаду бег настаўнік фізкультуры. Ляскоўскі не мог дараваць жуліку жартаў у Інтэрнэце. Цяпер была нагода адпомсціць.

Пад уплывам рашучага дзеяння кадраў мы акрыялі і зноў пачалі танчыць. Усе былі злосныя на Міколку і Ігара. Першы, падвергнуты мучэнням, да ўсяго прызнаўся. Ды яшчэ „ўкапаў" Ігара. Хлопцы з трэцяга класа нават дамовіліся, каб збіць Міколку. Ну, але хто нармальны захоча біцца з Міколкам? Хлапчук, які ўвесь час сядзіць на панадворку, так добра б'ецца, што нават старэйшыя баяцца яго чапаць.

З другога боку не было магчымасці адпомсціць. Канікулы Міколка зрабіў сабе два тыдні да зімовых канікулаў. А пасля месяца ўсё разышлося кругамі па вадзе.

тэкст:<natasza9922@wp.pl>
дызайн:<lolcia0505@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Не маю іншых

Раніцай Міколу
Надта сварыць мама:
— Чаму ідзеш у школу
З бруднымі вушамі?

І быў пад дзвярыма
Адказ Мікалая:
— Выходжу з такімі,
Бо іншых не маю.

Вырваў сотню злотых

Колька ў чарзе чакае
Да лекара зубнога.
Да вырвання ён мае
Зубоў малочных многа.

— А вырваў табе колькі?
Спыталі яго потым.
Адказвае Міколка:
— Ён вырваў сотню злотых.

Галерэя „Зоркі" (Беласток)

Кася Бялькевіч

фота Ганны Кандрацюк

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: **5,00.**

Твая мянушка: **Не маю мянушкі.**

У жыцці хачу стаць, чаму: **Хачу быць настаўніцай беларускай мовы, таму што я люблю дзяцей і беларускую мову.**

У сяброў цаню: **Шчырасць.**

Не люблю: **Фасолькі па-брэтонску і кантрольных.**

Па-беларуску размаўляю: **З настаўніцай, бацькамі, сябрамі ды дзедкам і бабуляй.**

Мой любімы гурт: **„Н.Р.М." , „The black eyed peas".**

Каля свайго дому пасаджу: **...снежную бабу.**

Польска-беларуская крыжаванка № 2



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 51: Пас, зіма, перамога, лата, агул, ода, ара, мерка, так. Зелле, ліра, маток, памада, сага, агат, ура, золак.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Магдаліна Сахарчук, Павел Саковіч, Пётр Казлоўскі** з Бельска-Падляшскага, **Лукаш Сцепанюк** з Гайнаўкі, **Паўліна Башун, Дыяна Капытка, Кася Саковіч, Кшыштаф Грыгарук** з Чыжоў. **Віншуем!**

Bardzo lubię Waszą gazetę, chociaż słabo czytam, ale co nie potrafię to mama przeczyta.

Wyznawcom Prawosławia życzę wesołych, rodzinnych Świąt Bożego Narodzenia, bogatego Mikołaja, chociaż ja też jeszcze czekam, może się zjawi. Moja mama nie pracuje, wychowuje nas sama, ale liczę, że nadchodzący rok będzie lepszy.

Szczęśliwego Nowego Roku, wszelkiej pomyślności i spełnienia marzeń dla Redakcji „Niwy" życzy Kasia z mamą i bratem.

Katarzyna KARWIEL, Białystok

Ад рэдакцыі:

Дарагая Кася! Дзякуем за святочныя пажаданні. Мы таксама жадаем Вашай сямейцы здаровых і радасных Каляд і шчодрага Санта Клаўса. Запрашаем цябе (пасля 10 студзеня г.г.) у рэдакцыю „Нівы". Тут чакаюць Цябе і Твайго браціка нашы кашулькі з „Зоркай".

У праваслаўным цэнтры ў Крыўцы сабраліся жыхары рознага ўзросту. Сярод публікі былі дзеткі, дарослыя і пенсіянеры. Усе прыйшлі паслухаць калядак. — На аглядах мы выступаем найчасцей з беларускімі песнямі. Калядкі спяваем яшчэ ў сваёй вёсцы і на сустрэчах наладжаных для калядоўшчыкаў, — кажа кіраўнік „Крыўчанак" Люба Дубко...

У Крыўцы калядавалі і святкавалі па-свойму

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Крыўчанкі" падмацаваныя мужчынскім голасам Міколы Тэслюка

У рэпертуары „Крыўчанак" многа калядак, якія спяваліся ў мінулым у Крыўцы і Гарадзіску. Зараз у беларускім калектыве спяваюць па тры асобы са згаданых вёсак, а рэпертуар падбіраецца, перш за ўсё, з мясцовай скарбніцы. Адметнасць і незвычайнасць калядак і фальклорнага рэпертуару ў Крыўцы і яго наваколлі заўважылі Дарафей Фіёнік, кіраўнік Музея малой айчыны ў Студзіводах і члены музейнага калектыву „Жэмэрва", якія сталі запісваць даўнія песні і наладзілі супрацоўніцтва з „Крыўчанкамі". З 25 па 28 снежня 2006 года ў Епархіяльным цэнтры праваслаўнай культуры ў Крыўцы студзіводскі музей арганізаваў музычны майстар-клас для абодвух саставаў калектыву „Жэмэрва", у ходзе якога бяльшчане ізноў мелі нагоду сустрэцца з „Крыўчанкамі". У перыяд посту моладзь з дапамогай вопытных вясковых жанчын вучылася спяваць калядкі і адначасна мела нагоду пазнаёміцца з філасофіяй даўняга вясковага жыцця, якая дапамагала сялянам пераадолець жахі войнаў, бежанства, усялякіх палітычных закалотаў і на працягу многіх стагоддзяў захаваць нацыянальную і канфесійную адметнасць, якую зараз некаторыя маладыя людзі не цэняць або нават ад яе адракаюцца. У час супольнай вечарыны, якая завяршыла заняткі, белгімназісты з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім, якія саставляюць малодшы склад „Жэмэрвы", спявалі мясцовыя калядкі з дапамогай сваіх апекуноў і слухалі калядны рэпертуар у выкананні „Крыўчанак". Былі таксама супольныя спевы аб хуткім надыходзе Ражджаства Хрыстовага. Перад жыхарамі Крыўца з калядной пастаноўкай выступіў таксама калектыў „Антракт" з Бельскага дома культуры.

— Раней мы запісалі ў Крыўцы калядкі, а зараз разам з „Крыўчанкамі" спяваем іх. Вельмі важны супольны спеў з вясковымі людзьмі, якія выхаваліся на народных творах. Мы маем нагоду на практыцы пазнаёміцца з мелодыяй, правільным вымаўленнем і навучыцца спяванню набліжанаму да аўтэнтычнага, — кажа кіраўнік „Жэмэрвы" Анна Фіёнік. — Добра, што маладыя людзі хочуць супольна працаваць і стараюцца, каб народныя творы ў іх выкананні былі як найбольш аўтэнтычнымі.

Бельская моладзь апрача спеву і экскурсій працавала з саломай. Дзяўчаты вучыліся выконваць павукі. Свае вырабы маладыя людзі забралі дамоў, а адзін павук пакінулі ў праваслаўным цэнтры.

— Цікавым атрымаўся наш майстар-клас. Лягчэй навучыцца спяваць калядкі, калі мы чуем іх у выкананні вясковых жанчын, што добра іх ведаюць, — заяўляюць бельскія белгімназісткі Кацярына Бабулевіч, Аляксандра Перавой, Ганна Мордань і Кацярына Нікалаюк і пачынаюць пералічваць названні вёсак сваіх бабуляў, у якіх яны калядуюць. Усе вучні з „Жэмэрвы" належаць таксама да тэатральнага калектыву „Антракт", якім апякуецца Альжбета Фіёнік і таму рашыліся выступіць з калядной пастаноўкай.

— Фальклор у Крыўцы вельмі багаты і адметны. Розніцца ён ад народных песень з іншых сёл мелодыямі і вымаўленнем. Можна тут пачуць калядкі са старэйшых багагласнікаў. Вельмі багатыя ў сяле агулькі і садонькі. Відаць, што людзі з Крыўца і яго наваколля вельмі многа спявалі, — гаворыць Дарафей Фіёнік і звяртае ўвагу на цеснае супрацоўніцтва музея з жанчынамі з Крыўца.

У праваслаўным цэнтры сабраліся жыхары рознага ўзросту. Сярод публікі былі дзеткі, дарослыя і пенсіянеры. Усе прыйшлі паслухаць калядак.

— На аглядах мы выступаем найчасцей з беларускімі песнямі. Калядкі спяваем яшчэ ў сваёй вёсцы і на сустрэчах наладжаных для калядоўшчыкаў, — кажа кіраўнік „Крыўчанак" Люба Дубко, якая пры васьмідзесяцігадовым узросце надалей захоўвае вялікую актыўнасць. — У мінулых гадах жанчыны з сяла калядавалі ў Крыўцы, збіраючы грошы на царкоўныя патрэбы і толькі мінулы год атрымаўся без калядавання. Апошнім часам найбольш актыўныя каляднікі ў нас гэта дзеткі і моладзь.

Спадарыня Люба Дубко пачынае ўспамінаць пра калядаванне ў мінулым, якое праходзіла ў адпаведнасці з вясковымі традыцыямі. Маладыя калядавалі з гвяздай і звярталі ўвагу на прывітальныя і развітальныя словы. Пасля ўсяночнай багаслужбы і літургіі маладыя людзі лепш адчувалі святочны настрой і разумелі змест калядак, у якіх славілася Хрыстовае нараджэнне.

— Наша моладзь на другі дзень Каляд таксама спачатку малілася ў царкве і толькі пазней ладзіла гасціну і танцы пад акардэон і балалайку, — успамінае спадарыня Дубко. — Пазней многа людзей выехала ў гарады і вёска стала пусцець. Тры хаты купілі ў нас гараджане. Шкада, што маладыя людзі не хочуць вяртацца на гаспадаркі. Калі наш сын Васіль памёр, таксама мы не ў змозе абрабіць усё поле. Унук вучыцца ў вышэйшай установе і мне вельмі хацелася б, каб ён вярнуўся на гаспадарку, бо ўсе сельскагаспадарчыя машыны ў нас ёсць і гаспадарчыя будынкі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Малодшы склад „Жэмэрвы" з кіраўніком Аннай Фіёнік (апошняя) і музычным апекуном Мартай Каліноўскай (трэцяя злева). Ззаду — павукі зробленыя ў час заняткаў

У час сустрэчы спявалася таксама калядка, з якой хадзілі жыхары вёсак па дамах на Хрышчэнне Гасподняе.

— Мы спяваем калядкі з колішнімі мелодыямі, так як нашы мамы спявалі, — кажуць Анна Тэслюк і Надзея Асіпюк з Гарадзіска і пачынаюць расказваць пра цяперашнія святкаванні. — Яшчэ і зараз у нашай вёсцы многа каляднікаў ходзіць. У мінулым годзе ажно 17 груп калядавала. Сярод іх былі таксама дзеткі і моладзь з Крыўца, Трывежы, Катоўкі. Прыходзяць да нас, бо ў Гарадзіску многа грошай даюць каляднікам. Старэйшыя людзі таксама калядуюць, а за сабраныя грошы купляюць неабходнае ў царкву — прыдбалі мы палавікі ў храм і далі грошы на званы.

У Гарадзіску ёсць яшчэ малодшыя гаспадары, якія перанялі поле ад бацькоў і абрабляюць яго. Менавіта іх дзеткі саставляюць калядуючую моладзь.

Жыхарам Крыўца спадабалася атмасфера, у якую ўвялі іх калядоўшчыкі. Калі спатканне мела закончыцца, старэйшыя людзі прасілі яшчэ заспяваць калядкі, якія напаміналі ім пра маладосць і ўводзілі ў святочны настрой, які спыняў роздумы аб штодзённых турботах. На развітанне кіраўнік праваслаўнага цэнтра айцец Аляксей Кулік пахваліў „Крыўчанак" і сабраных мясцовых людзей за актыўнасць у карысць захавання сваіх традыцый і веравызнання.

Аляксей МАРОЗ

Шчаслівыя дэсператы

— Беларуская свядомасць не мела і не будзе мець уплыву на тое ці мы тут астанемся. Беларусам можна адчуваць сябе ўсюды, не ўсюды, аднак, можаш знайсці добрую працу, — сцвярджае Рафал, але і ён, і шмат яго сяброў засталося на Падляшшы, каб вучыцца, жыць, не правяраюць сілы сваёй самасвядомасці на адлегласці. Праўда, частка дапускае магчымасць выезду пасля заканчэння вучобы, але перад усім тады, калі ўмовы не дазволяць нармальна жыць і працаваць.

— Буду шукаць працы ва ўстановах культуры ў Гайнаўцы, Бельску, Белавежы ці Беластоку, калі не ўдасца знайсці працу ў сваёй прафесіі, прымяню план „Б", выеду ў Прагу, там беспрацоўе складае 3%, на ўсякі выпадак ужо вывучаю чэшскую мову, — дадае Рафал.

Лукаш таксама падкрэслівае:

Адам

— Калі скончыцца праца ў Беластоку, паеду за хлебам нават за мяжу, але Беласток, насуперак агульнаму адчуванню, дае магчымасці зарабляць добрыя грошы, нават лепшыя чым у Варшаве.

Але пакуль што ніхто з іх не спяшаецца мяняць месца пражывання, штось прымушала іх астацца на Падляшшы.

— Прыналежу да свайго грамадства, ведаю яго патрабаванні, прывычкі, добра сябе тут адчуваю, — кажа Андрэй, — не мог бы я жыць недзе на поўдні краіны, бракавала б таго, чаго цяпер не бачу, не адмяжоўваючыся ад штодзённасці.

— Тут ёсць мая Малая айчына, мая сям'я, сябры, пакуль што яшчэ школа, але пабачым, што пасля заканчэння адукацыі ахвяруе Падляшша. Калі нічога сэнсоўнага, тады буду шукаць далей у Польшчы, — раздумвае Адам, — але за мяжу не збіраюся, хаця хто ведае што будзе праз год, што буду рабіць. Мо

Рафал

буду ўжо жанаты.

Гэта спецыфічнае, што многія не думаюць пра заўтра, жывуць сённяшнім днём, не маюць удакладненых планаў.

— Сёння ёсць так як мае быць, — рашуча канстатуе другі Андрэй, — а што будзе пасля школы? Напэўна будзе чым заняцца. А чаго

Міхал, Аня і Габрыся

няма тут, то ёсць тысячу кіламетраў адсюль? Маем усё патрэбнае да жыцця. Людзі застаюцца на Беласточчыне, бо гэта іх месца на зямлі, маюць вялікую чуллівасць да зямлі і яе багацця, якога часта нават не бачаць.

Наколькі большасць дапускае магчымасць выезду, бываюць адступленні.

— Тут у мяне сям'я, якая мне з'яўляецца ўсім. Можа гэта такі вясковы менталітэт, што жыву тут, дзе спакойна, дзе добра сябе адчуваю, — сцвярджае Міхал.

— Аня, ягоная жонка, зразу дадае:

— Хочам тут знайсці шчасце, каб наша дачка мела ўсё, а перш за ўсё спакой. Пасля зможа выехаць усюды, а мы будзем жыць думкай, што дачка з прыемнасцю будзе вяртацца на радзіму, няхай толькі зараджаць батарэі, але заўсёды са свядомасцю, што прыязджае да сябе.

Жывуць яны ў Гарадку. Вядома, дзіця малое, бацькі дапамогуць, тым болей, што займаюць паверх у Аніных бацькоў, але ў іх выказваннях не чуваць пра нейкі мус, пра нязручнасць сітуацыі, падкрэсліваюць свядомасць сваіх выбараў. Але не толькі яны жывуць з бацькамі. Большасць маіх суразмоўцаў падыходзіць з нармальнасцю да жыцця ў сямейным ачагу.

— Жыву я з бацькамі і прынамсі да канца навукі не будзе мне тое перашкаджаць, — кажа Рафал, а Андрэй дадае:

— Жыццё з бацькамі гэта проста выгода, можа часам і гультайства, але вынікае з матэрыяльнага становішча, а яно натуральна мяняецца.

Лукаш пасля вяртання з Варшавы таксама нейкі час жыў з бацькамі, пісаў у лакальную газету, апошнім часам нават хацеў ратаваць мясцовую культуру, прымаючы ўдзел у самаўрадавых выбарах. Не перашкаджае яму, што, расчараваны ўзроўнем беластоцкай адукацыі, не скончыў студыяў і як адзін з нямногіх шчасліўцаў робіць тое, што хоча, што яго цікавіць. Працуе шмат, таму яшчэ не думае пра сям'ю. Думка пра дзяўчыну і будучыню, наадварот, акрэслівае шлях Міхала, які канчае сярэднюю школу ў Бельску-Падляшскім.

— Не хачу патраціць кантакту з Падляшшам, астаюся тут, дзе добра сябе адчуваю, у месцы, якое добра ведаю. З другога боку, мая дзяўчына Ася жыве і вучыцца ў Беластоку. Гэта мая кацапскасць выклікае патрэбу жыць тутэйшым жыццём. Большасць маіх сяброў мае падобныя намеры.

Андрэй

— Свет ідзе ўперад, цяпер дарога з Гарадка ў Беласток займае столькі ж часу, што з аднаго канца Беластока ў другі, а яшчэ ёсць з кім пагаварыць, — пераконваюць Аня з Міхалам.

Абое яны яшчэ не закончылі адукацыі. Аня ўвесь час плануе здзейсніць сваю мару пра працу ў школе, але дыпломную работу напіша толькі тады, калі Габрыся падрасце. Аня любіць працу з дзяцьмі, іх удзячнасць, але кажуць, што каб стаць настаўнікам, трэба знайсці багатага мужа.

— Добра было б калі б Беларусь у канцы канцоў наведала дэмакратыя, тады можна было б заняцца гандлем. Будзем прадаваць сушаную рыбу ў Польшчы, а польскае піва ў Беларусі, — смяецца Міхал, а Аня дадае пра турыстычныя козыры Беларусі. Пакуль што іх галоўная мэта — выхаванне дачкі, яе здароўе, шчасце.

— Перш за ўсё буду старацца навучыць яе душэўнага спакою, якога якраз мне бракуе.

Лукаш

— Ну і мусім пачаць размаўляць з ёю па-беларуску, але самім нам трэба пераламацца, бо неяк натуральна з бацькамі гаворым па-польску. Аднак хочам, каб малая была двухмоўнай, каб сама дайшла да сваёй тоеснасці. Дамо ёй вуду, але рыбу няхай зловіць сама.

— Мае дзеці напэўна не будуць штодзень раніцай спяваць „Пагоню", хопіць быць ім свядомымі каранёў і традыцыі. Да літаратурнай мовы я не перакананы, не адчуваю ёй поўнасцю як сваёй, але дзеці можа будуць выхоўвацца нават трохмоўна... — жартоўным тонам дадае Міхал.

Выхаванне дзяцей гэта ў большасці справа далёкіх планаў, але, вядома, так як і шмат выбараў, залежыць ад свядомасці, а пра тую не вельмі ахвотна хочацца гаварыць. Адам кажа, што факт заставання на Падляшшы мусіць быць звязаны са спецыфікай фарміравання свядомасці.

— Свядомасць у кожнага іншая, гэта справа адзінак, так розных па характары, — кажа Андрэй як бы ўцякаючы ад канкрэтнага адказу.

Затое Лукаш распавядае шчыра:

— На беларускасць неяк адкрыта пачаў я глядзець у белліцэі, але грунтоўна ўмацаваў мяне ў справе Юрка Асеннік, які прыйшоў у школу з недаступнымі тады запісамі беларускіх рок-гуртоў.

Міхал

Большасць маладых — свядомых, наогул у розных ролях — дзейнічае ў беларускім руху, па-рознаму гэта абгрунтоўваючы, але напэўна не дзеля дабра чалавецтва.

— Гэта эгаістычная праца для сваёй прыемнасці, ніколі не чакаў я ад нікога „дзякуй", — дэкларуе рашуча Мішка.

Аня зразу лагодзіць жорсткае выказванне мужа:

— Я з вялікай сімпатыяй успамінаю розныя мерапрыемствы. Помніце тое Купалле? Толькі дзіўных, нават невядомых людзей, а як класна было!

Кожны з іх мог бы шмат чаго расказаць пра свой вопыт, гэта ўжо іх, можна з тым ісці далей.

— Пару разоў ездзіў я за мяжу, не пасмакаваў вялікіх грошай, таму гляджу на тое па-свойму. Кожны раз бракавала мне нашай гарадоцкай атмасферы. Мой план — застацца тут і дасягнуць поспеху на месцы. Людзей з такім рашэннем

Андрэй

успрымаю мацнейшымі, — кажа Андрэй.

Жыццё праз тэлефон, Інтэрнэт не іх мара. Добра калі ў сеціва можна заглянуць у хаце. Яно спалучае іх са светам, які хочуць пазнаваць, але толькі як турысты. Іх сапраўдны свет гэта бацькаўшчына.

Ілона КАРПЮК

Швейцарыя — Беларусь
узаемадзеянне культур
http://www.swiss-bel.of.by

Апошнім часам беларускае кіраўніцтва занятае тым, што шукае ворагаў блізка, а сяброў далёка. Менавіта таму ў Мінску з вялікай радасцю сустракаюць блізкага па духу венесуэльца Уга Чавеса і з вялікай непрыязнасцю ставяцца да краін, з якімі воляй лёсу наканавана быць суседзямі. Але еўрапейскае паходжанне беларусаў, хоць і прыціснутае лукашэнкаўскім рэжымам, прабіваецца ў розных праявах. Адной з іх ёсць сайт у Інтэрнэце, які называецца „Швейцарыя — Беларусь: узаемадзеянне культур".

Нягледзячы на зусім розную гісторыю, культуру і сучасныя варункі жыцця абедзвюх еўрапейскіх краін, для многіх беларусаў у Беларусі Швейцарыя ёсць ледзьве не ідэальным прыкладам правільных паводзін ва ўсім. Гэтая альпійская краіна цвёрда стаіць за свой нейтралітэт, не ўваходзячы ў аніякія палітычныя саюзы, талерантна ставіцца да моў тых людзей, якія яе насяляюць, і з'яўляецца ўзорам таго, як мусіць працаваць фінансавая сістэма дзяржавы. Здаецца, Швейцарыя не мае аніякіх праблем. Хаця такога, насамрэч, быць не можа і, каб убачыць больш-менш набліжанае да рэальнасці жыццё Швейцарскай Канфедэрацыі, варта зазірнуць на згаданы сайт, які месціцца па адрасе http://www.swiss-bel.of.by.

Першая старонка сайта выглядае даволі сціпла і ардынарна. Падзеленае на тры няроўныя часткі выяўленне вянчае сіняя „шапка", дзе месціцца назва сайта, праяўляюцца сілуэты заснежаных гор і маецца эмблема Швейцарскага агенцтва па развіцці і супрацоўніцтве. Што гэта за агенцтва і якія мэты ды задачы яго дзейнасці на даным сайце не распавядаецца. Але для прагнучых нешта даведацца аб ім варта клікнуць на эмблему, пасля чаго трапляем на сайт беларускага прадстаўніцтва агенцтва. Яно аказваецца часткай Міністэрства замежных спраў Швейцарыі.

Што ж да зместу швейцарска-беларускага сайта, то ён носіць выключна культурніцкі напрамак. На першай старонцы пасярэдзіне выяўлення размешчаны невялікія нататкі і анонсы апошніх, важных падзей міжкультурных дачыненняў. Так, менавіта адсюль мы можам даведацца, што пабачыў свет нямецка-беларускі слоўнік „фальшывых сяброў перакладчыка" і адкрылася выстава мастака, які адначасова з'яўляецца прэзідэнтам Таварыства „Беларусь-Швейцарыя".

Але каб бліжэй пазнаёміцца з краінай банкаў і гадзіннікаў, варта „прашпацыраваць" па рубрыках. Іх даволі многа і амаль усе яны маюць некалькі падрубрык. Так, на старонцы „Краіназнаўства" сярод іншага асобна распавядаецца пра дзяржаўны лад, гісторыю, асвету, геаграфію, навуку Швейцарыі.

Рубрыка „Культура" падзяляецца на літаратуру, мастацтва, масмедыі, кіно, тэатр і іншыя галіны культурнага жыцця альпійскай дзяржавы. А вось у „Асобах" гаворка мусіць ісці пра ўраджэнцаў Беларусі і ўраджэнцаў Швейцарыі, лёсы якіх былі звязаны з абедзвюма краінамі. На жаль, пра швейцарцаў, якія пакінулі свой след у беларускай культуры і гісторыі, сайт маўчыць.

Пазнаёміцца з відарысамі Швейцарыі дае магчымасць рубрыка „Фотагалерэя". Праўда, здымкаў тут не надта многа і подпісы на іх узнікаюць толькі тады, калі навядзеш мышкай.

Увогуле, даны сайт ёсць вельмі добрай крыніцай для таго, каб знаёміцца са Швейцарыяй па-беларуску. Нездарма яго рэдактарам з'яўляецца добра вядомы пісьменнік, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Далёка ад п'едэстала

Першыя дні новага года не прынеслі беларускім спартоўцам асаблівых поспехаў. Зімовы сезон толькі набірае абароты, а прадстаўнікі летніх відаў знаходзяцца пераважна ў адпачынку.

Папраўдзе ў зімовых відах, акрамя фрыстайла, беларускім заўзятарам і спадзявацца асабліва няма на што. Ну, а айчынныя лятаючыя акрабаты планава прапусцілі трэці этап Кубка свету ў Канадзе, чарговы старт яны цяпер возьмуць 12 студзеня ў ЗША. Па-ранейшаму ў коме знаходзіцца беларускі фрыстайліст Дзмітрый Рак, які атрымаў цяжкую траўму чэрапа на спаборніцтвах у Кітаі. Праўда, медыкі цяпер аптымістычна ацэньваюць яго стан.

Не спраўдзіліся стаўкі на нашу моладзевую хакейную зборную. Пасля стартавай перамогі над фінамі беларуская „эскадра" пайшла на дно, прайграўшы тры паядынкі запар — швейцарцам (1:4), расіянам (1:6) і чэхам (1:2). У выніку падначаленыя Эдуарда Занкаўца трапілі ў суцяшальны турнір за права застацца ў мацнейшым дывізіёне. Там яны пачалі з валявой перамогі над досыць моцнай нямецкай дружынай. Па ходзе сустрэчы беларусы саступалі, але ўрэшце схілілі шалю вагаў змагання на свой бок — 3:1. Зноў дуплетам вызначыўся Міхаіл Стэфановіч, мажліва, будучая зорка айчыннага хакея (дарэчы, сын вядомага хакеіста Ігара Стэфановіча, які пераважную частку сваёй кар'еры гуляў за гродзенскі „Нёман"). Турнірная сітуацыя склалася такім чынам, што ў апошняй гульні са славакамі беларусам месца ў элітным дывізіёне не гарантавала нават перамога. Лёс нашай каманды залежаў таксама ад зыходу паядынку Нямеччына — Швейцарыя. Але рэчаіснасць раструшчыла ўшчэнт усе надзеі. Беларуская моладзь саступіла равеснікам-славакам з катастрафічным лікам — 0:9. І прычына такой анамальнай паразы палягае толькі ў псіхалогіі. Такім чынам Беларусь зноў пакідае вышэйшы свет. Праўда, ходзяць чуткі, што фармат турніру можа быць пашыраны з 10 цяперашніх да 12 камандаў.

У скачках з трампліна беларусы па-ранейшаму далёка ад п'едэстала. На апошніх спаборніцтвах абодва нашы прадстаўнікі — Максім Анісімаў і Пётр Чаадаеў размяшчаюцца ажно ў шостым дзесятку. Штосьці няма спартовага росту гэтых маладых скакуноў. Блякла пачаў сезон і мацнейшы беларускі лыжнік Сяргей Далідовіч. На турніры ў Мюнхене ў розных лыжных намінацыях (каньковы і класічны ход, дуатлон) яму не ўдалося трапіць нават у трыццатку мацнейшых.

Пасля пэўнага перапынку зноў „пайшлі ў бой" біятланісты. На этапе Кубка свету ў нямецкім Оберхафе беларуская жаночая эстафетная дружына паказала лепшы свой вынік у сезоне. У складаных кліматычных умовах нашы дзяўчаты сталі пятымі, прытым апярэдзіўшы ўсходніх суседак — расіянак. Для абноўленай перад сезонам на 50 адсоткаў каманды гэта маленькі поспех. Цяпер у складзе квартэта выступаюць Дар'я Дамрачова, Вольга Кудрашова, Людміла Ананька і Наталля Сакалова. А вось мужчыны-біятланісты ні на паступовы прагрэс, ні на сенсацыю пакуль не здольныя. У аналагічнай эстафеце яны занялі толькі 12-е месца. Пра п'едэстал ім і не мроіцца.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Куцця ў Трасцянцы

Аднымі з першых у трасцяніцкую святліцу, адначасова пажарнае дэпо і бібліятэку — увесь цэнтр культуры ў гэтай найдаўжэйшай вёсцы Беласточчыны — прыйшлі цёткі Оля Самсэль, Оля і Люба Пашко, Анна Янюк, Марыя Рыбінская, Вера Мінько, Ганна Максімчук, Зося Петручук, Надзя Іванюк, Надзя Радзіванюк і дзядзька Ян Сцепанюк. А за імі — поўная зала аднавяскоўцаў, сярод іх і жыхары трасцяніцкага дома сацыяльнай апекі. Ва ўпрыгожанай па-святочнаму вялікай зале і ў кухні завіхаліся арганізатаркі — працаўніцы Гміннай публічнай бібліятэкі ў Нарве на чале з дырэктаркай Аннай Андраюк-Савіцкай. Разам з Асяродкам міласэрнасці ў Трасцянцы падрыхтавалі яны Куццю для адзінокіх і старэйшых жыхароў ваколіцы. Пасобілі ім фінансава Кааператыўны банк, пякарня ў Нарве, РСП „Рольмак" у Макаўцы і Гмінная камісія па справах алкагольных праблем. Прысутнічалі таксама духоўныя асобы — бацюшка Юры Ахрымюк, пробашч Збігнеў Нямыйскі, а. дэкан Васілій Рошчанка, а. Юрый Кос, а таксама гмінныя і самаўрадавыя ўлады. Сабраным на Куцці калядную праграму прадставілі вучні ПШ у Нарве, пачынаючы з беларускіх калядак — паказалі яслі, з Багародзіцай з Дзіцяткам, Іосіфам, анёламі, пастушкамі. Хор „Рамонка" з Ласінкі цудоўна праспяваў калядныя песні на чатырох мовах, а калектыў „Рэчанька" з Козлікаў прадставіў тутэйшы калядны абрад. „Праўду кажуць!" — казала цётка Вера да Яўгінні: на стале на сцэне стаялі і стравы такія як аўсяны кісель, і „аладкі на язык гладкі", а перад усім зараз пасля макавай куцці трэба было з'есці часнок (*Муоцны часнік — каб было муоцнэ здоров'е*). І ўсё як трэба — без нажа, аддзялялі па кавалачку. Пасля нельга мыць лыжак-відэльцаў, каб сям'я дружная была. І няз'едзенай вячэры не збіраць, а пакінуць, каб і адышоўшыя пажывіліся. Пасля прамоваў і малітваў усе сталі частавацца святочнай вячэрай і гаманіць. Сярод гасцей пайшла размова старых калядоўшчыкаў пра колішняе калядаванне і падрыхтоўкі. Войт Якуб Садоўскі і старшыня Рады Яўген Дудзіч (знакаміты голас!) — абодва родам з Тыневіч і доктар Сцяпан Кучынскі, ён жа старшыня супрацьалкагольнай камісіі, родам з Мора, заўзятыя калядніки, разважалі пра „папэру на кутасы", успаміналі, як рабілася бібулу празрыстай, пра асвятленне гвяздаў... Моладзь парассядалася была за сталамі сярод пажылых жыхароў — і надта было цікава рамонкам-дзяўчаткам (з адным хлопцам) сядзець і слухаць, што скажуць бабулі Марыя Семянюк ці Насця Сіняковіч, пры шчырай цеплыні сэрцаў, несамотныя.

(лук)

Яны першымі завіталі на куццю

фота архіў „Нівы”

Слёзы радасці

Айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна

Перадаю я нізкі паклон і выказваю вялікі дзякуй айцу Рыгору Сасне і матушцы Антаніне Троц-Сасне за кніжку „Святыя месцы і цудоўныя іконы”. Чытаў я яе ўголас, хвілінамі мы радаваліся і нават плакалі ўсёй сям’ёй. Толькі гэта былі слёзы радасці. А нам іх цяпер так мала бывае. Больш маем жыццёвых турбот, чым уцех. Дарагія ойча і матушка, Вы працуеце як пчолкі, збіраеце веды аб нашай праваслаўнай веры, а потым складаеце кніжку, каб перадаць яе другім. Вялікая гэта праца і добрая, адданая справа. Многія вернікі даведваюцца, дзе ў нашай краіне знаходзяцца і знаходзіліся даўней святыя месцы і цудоўныя іконы.

А цяпер калі запытаць маладых, то некаторыя — апрача Грабаркі ці Старога Корніна — больш і не ведаюць. А аб Старым Корніне ведаюць толькі тое, што сюды 7 жніўня штогод збіраецца шмат народу. Гэта свята Анны. А больш аб гэтым храме нічога не скажуць. Бо адкуль ім ведаць? А вось дзякучы Вам, даследчыкам праваслаўнай веры на нашых землях, можам многа цікавага аб ёй даведацца і перадаць другім. Дзякуючы Вам, памяць аб помніках праваслаўнай веры між намі не загіне. Як кажуць: „Што напісана пяром, не вырубіш тапаром”. Дзякуючы кніжцы, многія даведаюцца, дзе ў нашых мясцінах знаходзіліся і знаходзяцца святыя месцы і цудоўныя іконы. Людзі даўней і цяпер прыходзяць да іх памаліцца, каб атрымаць дапамогу Усявышняга.

Цяпер многія наракаюць, што цудаў няма, што святыя іконы не дапамагаюць. Над гэтым трэба глыбей нам задумацца. А можа мы самі ў гэтым вінаватыя? Як калісьці жылі нашы продкі, а як мы свой век пражываем? Нашы продкі Госпадам Богам жылі і наказы Ягоныя выконвалі. А мы цяпер толькі аб цела сваё дбаем, а ўсё што для Госпада Бога — на пазней адкладваем. Гасподзь у нас цяпер, быццам дадатак да жыцця, без якога можна жыць. А без Госпада жыць нельга. Праўду прыказка гаворыць: „Без Бога, не да парога”. Гасподзь ёсць усюды, Ён жа Дух Святы, а Святым Духам усё жыве. Толькі аб гэтым людзі даўней памяталі, часцей у царкву хадзілі, з надзеяй і верай Богу маліліся і блізкіх сваіх кахалі. Таму і цуды здзяйсняліся, таму і святыя месцы часцей наведвалі — верай і надзеяй у Бога жылі. І Гасподзь аб іх не забываў. Сляпыя свет бачылі па малітве сваёй, калекі хадзіць пачыналі. Гасподзь вернікаў сваіх не пакідаў.

Цяпер усё адмянілася. Большасць людзей бажкамі на зямлі парабіліся. Усё яны ведаюць самі, лепшай веры шукаюць, бацькоўскую веру пад ногі ўзялі, патапталі зусім, граху не прызнаюць, хадзіць у царкву не хочуць. Кажуць: „А навошта? А што царква нам дае? Толькі ахвяру давай!” А тыя, што ходзяць, нічога ад Бога не маюць. Жывуць так, як і ўсе. І хварэюць, і паміраюць, і цудаў ніякіх не маюць. Праўду Гасподзь калісьці сказаў: „Вы бачыце мяне, дык не верыце. А што сказаць аб тых, што мяне не ўбачаць!” Людзі аб усім забываюць, таму і Усявышні не хоча ведаць аб нас. А Вы, дарагі айцец Рыгор, стараецеся нам аб гэтым прыпомніць. Ваша кніжка гэта багатая крыніца ведаў аб праваслаўнай веры на нашых землях. Яна нам прыпамінае калі і дзе паўсталі святыя месцы, хто пабудаваў там першыя цэрквы, ад чаго выводзяцца назвы мясцін і вёсак, хто быў фундатарам гэтых храмаў. Кніжка прыпамінае аб цудах, якія там здзейсніліся, гаворыць аб святых, якія апекаваліся гэтымі месцамі. І дзякуючы ім людзі атрымлівалі збаўленне душы і цела.

Другая частка кніжкі прысвечаная цудоўным іконам на нашых землях. Прыпамінае яна да якіх іконаў народ імкнуўся, ад якіх атрымоўваў дапамогу, прыгадвае адкуль яны паявіліся і чым яны праславіліся. А яшчэ можна даведацца як каталіцкія касцельныя ўлады стараліся перацягнуць праваслаўныя месцы на свой бок. І часта гэта ім удавалася. Так прапалі нашы святыні ў Гадышэве, Ружаным Стоку ці Васількаве. Гэта толькі частка нашай праваслаўнай спадчыны, якую мы ўтрацілі. Гэта паказвае таксама да чаго імкнуўся Каталіцкі касцёл даўней і цяпер. Няхай яму гэта пойдзе на здароўе. Гасподзь — суддзя над усімі намі і Яму судзіць аб усім. Нам толькі астаецца цяжка ўздыхнуць і з горыччу прамовіць: „Госпадзе, хай будзе па праўдзе Тваёй і па Тваёй волі”.

Грыша МАРОЗ

Нясіце крыж Хрыстовы

Айцу Рыгору
і матушцы Антаніне Соснам

Нясіце крыж Хрыстовы,
Згодна з евангельскім Словам,
Нясіце яго высока,
Бо Хрыстос важней прарокаў.

Гэта Бог шле нам падарунак,
З Ісусам людзям ратунак
Ад крывадушнай славы
Народам і дзяржавам.

Бяда, калі царыць бязбожнасць,
Калі ў душах раздарожжа,
Адтуль выходзяць пажары
Па безліч нявінных ахвяраў.

Няхай тое гора нас мінае,
Няхай кожны Хрыста шукае,
А каб не збіцца з дарогі
Папросім Ягонай падмогі.

А я — здаецца — грэшнік першы,
Што кожны ад мяне лепшы.
Бо часам ад успаміну нялёгка,
Быццам між прорвай і вяроўкай.

Няхай у наступаючым годзе
Нашымі ўчынкамі штодзень
Навучанне Ісуса кіруе,
У сэрцах хай радасць пануе.

Каб чуць нам падказку анёлаў,
Каб зернем пасеяць здаровым,
Каб праведна колас наліўся
Каб хлебам народ насыціўся.

Прыносьма з малітвай ахвяры,
Няхай нам ніякія хмары
Не ставяць на душах заслонаў.
Нясемце крыж праўды Хрыстовай!

Мікалай ПАНФІЛЮК

Чарговы год

Наступіў зноў год чарговы
І чарговы раз ён — Новы!
Што ён прынясе — невядома,
Як нам будзе навонкі і дома.

Зноў чакаць нам выпрабаванняў
У чарговых жыццёвых змаганнях;
Нашым ворагам выбачаць,
Сваё роднае шанаваць.

Будуць радасці, будуць трывогі,
Але нельга збівацца з дарогі.
І на стораны нельга віхляцца —
Свайго роднага трэба трымацца!

Бо хаця цяпер час без прыгону,
Без ярма, без папругі і шораў,
Многа хто з нас шукае той „школы”,
Ад каторай духова ён голы.

Каб нашы, дай Божа, нашчадкі
Жылі ўсёй душой роднай хаткі,
І на мове бацькоў шчабяталі,
І старонку сваю праслаўлялі.

Мы жывём і паволі старэем
І працуем як толькі умеем.
Пажылым ужо час адпачыць,
Дасягненні свае падлічыць.

Каб за моладзь сваю ганарыцца:
Беларусамі пахваліцца.
Каб спакойны падляшскі наш люд
Шанаваў сваю родну зямлю.

Новы год — апраўдай нашы мары,
Каб жылося у згоднай нам пары,
Хай дзяцей больш прыносяць нам буслы,
Шчодры будзь ва ўсім беларусам!

Мікалай ПАНФІЛЮК

Міхалова

Міхалова — гожае мястэчка,
Трэба вам аб гэтым знаць,
А за добрую работу
Войта трэба шанаваць.

Ёсць тут і касцёл з царквою
Што на ўзгорачках стаяць,
Людзі шчыра ў іх моляцца,
Каб Бога праслаўляць.

Па-суседску жывуць у згодзе
Праваслаўны і католік:
Адзін аднаго клічуць у госці
Святкаваць за адзін столік.

Школу новую пабудавалі,
Яна як зорачка блішчыць.
Толькі чаму у новай школе
Беларуская мова не гучыць?

Можа райцы нам адкажуць,
Што ў гміне там сядзяць:
Ці бацькі, хоць беларусы,
Не хочуць роднай мовы знаць?

Ці іх гэта не абходзіць
Навучыць сваё дзіця?! —
Не цурацца роднай мовы,
Заўжды яе шанаваць?!

Можа Грэсь у сваёй газеце
Хоць раз аб гэтым успамяне —
Ён таксама ж беларус —
Ды сумленні ўскалыхне?

Потым хтосьці адгукнецца
Каб у „Ніве” абвясціць:
Што ўжо ў Міхалове
Беларуская мова зноў гучыць!

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 2 000 egz.

З НОВЫМ 2007 ГОДАМ!

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ
Беласток 105,5 ФМ

Мы даступныя кругласутачна ў інтэрнэце!

www.racyja.com
www.radioracja.pl
www.racyja.by

Адрас:
Białoruskie Radio Racja
ul. Ciepła 1/7
15-472 Białystok
e-mail: radioracja@wp.pl
tel. 085 654 51 93

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

Зямлю абдымаю вачыма
Тулюсь, нібы да дзяўчыны.
Шапчу:
—Дарагая, скажы,
Чаму я жыву на мяжы?

Чаму я заўжды вінаваты?
Чаму чужынцы спаганьваюць хату?
Скажы,
Дарагая, як жыць?
У родным доме выгнаннікам быць?

Чаму на бяскрэссі прастораў
У хаце маёй аж цесна ад гора?
Скажы,
Дарагая, скажы,
Ці доўга мне жыць на мяжы?

Міхась Шаховіч

фота Аляксандра Вярбіцкага

Polskie Radio Białystok

ШЧОДРЫ ВЕЧАР З РАДЫЁ БЕЛАСТОК

Пачынаем 13 студзеня а 19:00 гадзіне і гуляем да 5. раніцы

У перадачы добрая беларуская музыка і пажаданьні
Слухайце нас на хвалях FM 99,4-98,6-104,1-87,9-89,4

Адгаданка

Раманс

(анаграмная шарада)

Цемра начная ўзышла над зямлёю,
Светлую згадку падкінула мне...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Ноч абярнулася ў дзень.
З гэтай пары я жыўлюся надзеяй,
*Цвёрдая **ВЕРА** гартуе мяне —*
Наша каханне цяпер палымнее
І не пагасне навек.
Зноўку расстацца нам час наступае,
Зноў наша светач купаецца ў сне.
*Ты **НЕ** сумуй загадзя, дарагая —*
*Глянь хоць **РАЗОК** на мяне!*

Рашэнне адгаданкі складуць словы, утвораныя з перастаноўкі патоўшчаных літар; пачатковыя літары і іх колькасць у разгадцы: З-5, В-6.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 49 нумара

Хвароба, аматар, Этна, давальны, Казярог, кроў, чэкіст, Гагарын.

Рашэнне: **Хмары, гэта вандроўныя рэкі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Сардэчна дзякуем усім нашым Чытачам і ўстановам, якія павіншавалі нас з Нараджэннем Хрыстовым і Новым годам.

Рэдакцыя

14.01 – 20.01

Баран (22.03. — 20.04.) Карусель пачуццяў моцна закруне табе ў галаве — раз будзеш кахаць з усяе моцы, раз — ненавідзець. На працы выкарыстаеш сваю баявітасць і сілу пераконвання. Будзеш дакладна ведаць, чаго хочаш ад каханай асобы — адно што добра было б трапіць на такую, якая справілася б з тваімі патрэбамі!

Бык (21.04. — 21.05.) З 19.01. свету не будзеш бачыць за каханай асобай. Блага гэта можа адбіцца на працы. Затое можа пашанцаваць у латарэі (аж да канца месяца)! З 20.01. не ўваходзь у шуры-муры з начальнікам.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Мала табе будзе пахвал кіраўніцтва і прызнання калег — захочаш павышэння або хоць дабаўкі. Будзеш адважна выказваць свае думкі. Затое менш рашучасці ў пачуццях.

Рак (23.06. — 23.07.) 14-17.01. змаганне ў пары можа кончыцца балюча для абодвух бакоў. 19.01. знаёміта з пачуццямі; вялікі шанц поспеху. Супакойся з распустай з грашыма!

Леў (24.07. — 23.08.) Поруч з партнёрам будзеш мець падтрымку і зразуменне. Разам з прылівам грошай паявяцца спакусы. Сваркі з-за драбязы могуць папсаваць настрой. Пагражаюць табе хваробы ад прастуды, болі вушэй і насавых пазух; цяплей апранайся!

Дзева (24.08. — 23.09.) Ідылія на працы, хоць хатнія могуць папсаваць твае планы. Калі ты была без пары, можаш пазнаёміцца з кімсьці, хто табе поўнасцю закруне ў галаве; не будзеш, дарэчы, занадта пераборлівая. Калі абраннік выявіць сваю адвагу і рашучасць, будзеш на сёмым небе!

Шалі (24.09. — 23.10.) З 19.01. можаш залішне звяртаць увагу на штосьці, што таго нявартае. 20.01. будзь асцярожны з інвестыцыямі. У любові спрыяюць табе Венера і размоўны Меркурый; можаш сустрэць кагосьці цікавага, хто ўжо размовай (і не толькі!) давядзе цябе да экстазу.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Да 15.01. мноства энергіі, шчасце і ў фінансах. У пары бухнуць парай і іскрамі жарсці. Творчы размах. Вечары з асобай, якая цябе разумее без слоў і ведае цябе больш за ўсіх у свеце.

Стралец (23.11. — 22.12.) Адвага, пачуццё гумару, жыццярадаснасць. Энергія, ахвота да вялікіх змен у жыцці. Добры час на перамовы ў справе кампрамісаў. Усё можаш ставіць па-свойму.

Казярог (23.12. — 20.01.) Упартасць; зможаш вывесці на просты шлях справы, з якімі ты дагэтуль не спраўляўся. Шукаючы працу, добра падрыхтуйся да размовы з новым шэфам.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Захапленне асобай, з якой у апошні час фліртуеш, расплывецца, як ранішняя імгла. Трымайся таксама за кішэню, каб таксама не расплыліся твае ашчаднасці! З 18.01. нестабільная сітуацыя ў інтарэсах.

Рыбы (20.02. — 21.03.) З 17.01. ідэальная пара на флірты. Раман можа разгарэцца ў палымянае каханне! Да 15.01. магчымыя праблемы на працы. Кіруйся інтуіцыяй, слухай парад вопытных сяброў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960